БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

АДЗІНЫМ ФРОНТАМ ЗА СУСЬВЕТНЫ КАСТРЫЧНІК.

Нядаўна ў Бэрліне адбыўся першы ўсенямецкі зьезд працоўных жанчын. Папярэдня зьезду адбылося ў Нямеччыне 28 жаночых канфэрэнцый, з удзелам 3-х тысяч дэлегатак, галоўным чынам беспартыйных работніц.

У капіталістычнай Нямеччыне, наладжваць такія зьезды рабочых ці работніц—справа цяжкая. За ўдзел у іх караюць Вельмі часта за ўдзел у рабочых сходах травіць паліцыя, арыштоўвае, фабрыкант можа выкінуць з свае фабрыкі, пазбавіўшы яе і сям'ю нават таго мізэрнага заработку, які работніца мае зараз. трацячы многа сіл на капіталіста. Перад работніцай заўсёды страшэнная пагроза—апынуцца ў галоднай арміі беспрацоўных.

І ўсё-ж не спалохала работніц Нямеччыны ўсё гэта. Яны арганізавалі канфэрэнцыі і зьезды на свае мізэрныя сродкі.

На першым усегерманскім зьезьдзе прысутнічала 408 дэлегатак і 350 гасьцей. Як дэлегаткі, так і госьці, гэта галоўным чынам—работніцы прадпрыемстваў, батрачкі, работніцы саматужнай прамысловасьці. 302 дэлегаткі гэтага зьезду былі абраны на фабрычна-завадзкіх прадпрыемствах. Беспартыйных працоўных жанчын тут было 233, а камуністак—163. Астатнія—камсамолкі, і саюзу „Спартак".

Гэты важны зьезд быў скліканы камуністычнай партыяй Нямеччыны. Ён паказаў, што рэвалюцыйны рух жанчын многа ўзрос і Компартыя Нямеччыны дамаглася тут вялізарных посьпехаў.

Кожная выступаўшая на канфэрэнцыі, а пасьля і на кангрэсе работніца, даводзіла аб неабходнасьці арганізацыі згуртаваньня рабочых мас, для рашучага адпору наступленьню капіталу.

Кожная ўдзельніца сходу, канфэрэнцыі,—пераканалася ў тым, што не адна яна пакутуе ад непасільна цяжкіх умоў працы, ад узмоцненай, штодзённай эксплёатацыі. Кожная ўпэўнілася, што няма капіталіста добрага і кепскага, што бяда не ў асобе, а ва ўсёй капіталістычнай сыстэме. Адначасова кожная работніца ўпэўнілася ў тым, што не адна яна ўсьвядоміла неабходнасьць барацьбы, а к гэтай барацьбе рыхтуецца ўся рабочая кляса. Яскрава і выразна было пастаўлена пытаньне аб тым, што адзіным правадыром і кіраўніком пралетарыяту ў яго барацьбе зьяўляецца толькі Камуністычная партыя, якая не на словах, а на справе абараняе інтарэсы рабочае клясы.

Работніцы ў сваіх прамовах падкрэсьлівалі небясьпеку вайны супроць СССР, падрыхтоўваемай капіталістымі і неабходнасьць для пралетарыяту ўсіх краін—абараняць СССР.

На кангрэсе абмяркоўваліся 2 пытаньні:

1—становішча работніцы і працоўнай жанчыны, іх барацьба за хлеб, за павышэньне зарплаты, супроць беспрацоўя, супроць імпэрыялістычнай вайны, і

2—праграма дзеяньняў работніц Нямеччыны.

Прынятая кангрэсам праграма дзеяньняў ставіць перад работніцамі задачу барацьбы супроць падрыхтоўваемай капіталістамі імпэрыялістычнай вайны. Праграма разаблачае сацыял-фашыстых і фашысцкія жаночыя арганізацыі. Праграма ставіць шэраг запатрабаваньняў у сувязі з барацьбою за павышэньне заработнай платы, яна патрабуе скарачэньня рабочага дню да 7 гадзін. Праграма падкрэсьлівае выразную лінію барацьбы рэвалюцыйных рабочых, абавязуе кожную клясава-сьвядомую працоўную жанчыну быць гатовай к абароне СССР.

Усегерманскі кангрэс паказаў надзвычайна вырасшую зацікаўленасьць работніц к СССР. На ўсіх сходах, канфэрэнцыях, работніцы патрабавалі пасылкі дэлегацыі работніц у СССР.

Зараз на тэрыторыі Савецкага Саюзу гасьцююць 15 нямецкіх работніц,—удзельніц кангрэсу, абраных сваімі прадпрыемствамі ці канфэрэнцыямі. На самым кангрэсе было абрана 3 дэлегаткі.

Дэлегацыя, прыехаўшая ў СССР дапаможа Камуністычнай партыі Нямеччыны замацаваць вынікі канфэрэнцыі, узмацніць уплыў Компартыі Нямеччыны на працоўныя жаночыя масы Нямеччыны.

Збор супроць фашысцкай маладой гвардыі—Бэрлін (Нямеччына).

ЦЭНТР. ГОСБИБЛИОТЕКА Т.С.С.Р.
Инв. № 13

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

№ 22. | ОРГАН АДДЗЕЛУ РАБОТНІЦ І СЯЛЯНАК ЦК КП(б)Б. | Сьнежань, 1929 г.

...„Газэта—ня толькі каляктыўны прапагандыст і агітатар, але таксама і каляктыўны арганізатар. У гэтых адносінах яе можна параўняць з рыштаваньнямі, якія ўзводзяцца навокал будынку, намячаюць контуры яго, аблягчаюць зносіны між асобнымі будаўнікамі, дапамагаюць ім разьмяркоўваць работу, аглядаць вынікі, дасягнутыя арганізаванаю працаю".

(Ленін).

ПЯЦЬ ГОД.

У лістападзе адбудзецца пяць год з часу выхаду першага нумару часопісі „Беларуская Работніца і Сялянка"—органу Аддзелу работніц і сялянак Цэнтральнага Камітэту Камуністычнай Партыі Беларусі.

Згуртаваць вакол партыі шырокія колы работніц, батрачак, бяднячак і сераднячак для актыўнага ўдзелу іх у сацыялістычным будаўніцтве, для выкананьня пяцігадовага пляну, вось аснаўная задача „Беларускай Работніцы і Сялянкі".

Шпаркі тэмп нашай стройкі, магутны рост новых фабрык, заводаў, электрастанцый, нябачаны дагэтуль размах каляктывізацыі сельскай гаспадаркі—даў нам першы год выкананьня пяцігодкі. Дасягнуты гэтыя посьпехі таму, што шырокія працоўныя масы моцна згуртаваліся вакол партыі, каб пабудаваць сацыялізм. Творчы ўздым энэргіі працоўных, выліўшыйся ў сацыялістычным спаборніцтве, захапіў ня толькі фабрыкі і заводы, але перакінуўся ў савгасы, калгасы і вёскі.

Праз друк Камуністычная партыя арганізуе рабочую клясу і працоўнае сялянства для пераможнага будаўніцтва сацыялізму, праз друк шырокія масы працоўных пераклікаюцца між сабою аб дасягненьнях у сацыялістычнай стройцы, аб змаганьні з недахопамі, якія ячшэ маюцца на нашым шляху.

„Беларуская Работніца і Сялянка" аб'яднае шырокія колы працоўных жанчын для справы сацыялістычнага будаўніцтва, для рашучай барацьбы з усякімі ўхіламі ад генэральнай лініі Камуністычнай партыі і асабліва правым ухілам, як найбольш небясьпечным у сучасны пэрыяд.

„Беларуская Работніца і Сялянка" яшчэ больш уздымае актыўнасьць работніц вакол справы рацыяналізацыі вытворчасьці, павышэньня якасьці, патаненьня прадукцыі і далейшага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва.

Часопісь уздымае актыўнасьць батрачак, бядначак і сераднячак вакол справы калектывізацыі вёскі.

„Беларуская Работніца і Сялянка" дапамагае арганізацыі працоўных жанчын для адпору клясаваму ворагу—кулаку і нэпману. Праз часопісь работніцы, батрачкі, бяднячкі і сераднячкі змагаюцца з шкоднікамі, бюрократамі і цяганіншчыкамі.

Шляхам шырокай самакрытыкі на старонках часопісі працоўныя жанчыны дапамагаюць выкрываньню недахопаў у сацыялістычным будаўніцтве.

Праз „Беларускую Работніцу і Сялянку" працоўная жанчына Беларусі пераклікаецца аб удзеле ў сацыялістычным будаўніцтве, аб вылучэньні і падрыхтоўцы новых кадраў работніц, батрачак і працоўных сялянак для кіруючай работы ў прамысловасьці, сельскай гаспадаркі, аб рабоце ў саветах, прафсаюзах і каапэрацыі; дзеляцца вопытам работы па сацыялістычнай перабудове прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, знаёміцца з жыцьцём прадпрыемств, калгасаў і камун.

Праз „Беларускую Работніцу і Сялянку" працоўныя жанчыны сачаць за нясупыннай падрыхтоўкай капіталістых для нападу на краіну саветаў, пера-

глядаюць сваю здольнасьць абараняць заваёвы Кастрычніка, куюць моцны тыл для Чырвонай арміі. Праз часопісь працоўная жанчына Беларусі знаёміцца з барацьбой рабочай клясы. Захаду і Ўсходу супроць капіталістых.

Праз часопісь работніцы і працоўныя сялянкі Беларусі змагаюцца за пабудову новага быту, за ўздым культурнага ўзроўня працоўных, за зьнішчэньне няпісьменнасьці.

„Беларуская Работніца і Сялянка“ дапамагае выхаваньню лепшай часткі работніц, батрачак і бяднячак для папаўненьня шэрагаў Камуністычнай партыі.

Мы пераможна будуем сацыялізм таму, што пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі рабочая кляса вядзе за сабой аснаўныя масы сялянства. І як кіраўнік сялянства рабочая кляса павінна ведаць мову, якой карыстаецца пераважная маса бядняцка-серадняцкіх колаў вёскі.

Вось чаму зараз рабочыя і работніцы Беларусі вывучаюць беларускую мову. Таму і часопісь з гэтага часу будзе выдавацца на беларускай мове.

Гэтым яна дапаможа ўздыму культурнага ўзроўню працоўных жанчын Беларусі, удзелу іх у разьвіцьці беларускай пралетарскай культуры.

Часопісь дапамагае справе інтэрнацыянальнага выхаваньня працоўных жанчын, яна ўзброівае іх для барацьбы супроць усялякіх вылазак клясавага ворага, супроць розных праяў шовінізму ўсіх колераў і асабліва супроць беларускага шовінізму, нацыянал-дэмакратызму і прымірэнскіх адносін да іх.

Пяцігадовы юбілей „Беларускай Работніцы і Сялянкі“ трэба скарыстаць для ўзмацненьня сувязі часопісу з масай работніц і працоўных сялянак.

Пяць год назад часопісь выходзіла раз у месяц і мела толькі 3 тысячы падпішчыкаў. К свайму пяцігодзьдзю часопісь выходзе 2 разы ў месяц і мае 12.600 падпішчыкаў. Але гэтых посьпехаў недастаткова. Да кожнай фабрыкі, заводу, савгасу, калгасу і вёскі павінна дайсьці часопісь.

Менская, Гомельская і Віцебская акругі ўступілі ў сацыялістычнае спаборніцтва на лепшую работу з часопісам, яно праводзіцца ў шэрагу раёнаў, прадпрыемст і вёсак. Гэта спаборніцтва павінна даць тысячы новых чытачак, рабкорак і сялькорак, якія дапамагаюць ствараць часопісь.

Гурткамі прыхільнікаў „Беларускай Работніцы і Сялянкі“ трэба ахапіць шырокія масы працоўных жанчын, праз актывістак азнаёміць з часопісьсю кожную працоўную жанчыну.

Тэмп нашай сацыялістычнай стройкі патрабуе ўцягненьня ў справу сацыялістычнага будаўніцтва шырокіх мас работніц, батрачак і працоўных сялянак.

Часопісь дапамагае выхаваньню гэтых кадраў.

Таму кожная работніца, батрачка, бяднячка і сераднячка павінна ведаць сваю часопісь, дапамагаць зьнішчаць недахопы, якія маюцца ў часопісу.

За палепшаньне якасьці часопісі, за ўзмацненьне шэрагаў рабсялькорак, за павялічэньне ліку чытачак „Беларускай Работніцы і Сялянкі“— арганізатара работніц, батрачак і працоўных сялянак вакол Камуністычнай партыі.



Гарачае вітаньне армейцу бальшавіцкага друку—часопісі „Работніца і Сялянка".

Сёньня прашло пяць год з дню выхаду ў сьвет першага нумару часопісі „Беларуская Работніца і Сялянка". Ад нерэгулярнага выхаду раз у месяц, ад тыражу ў 3.000 экзэмпляраў часопісь „Беларуская Работніца і Сялянка" змагла моцна стаць на ногі, „абрасьці" сеткаю рабоча-сялянскіх карэспандэнтак, павялічыць тыраж да 12.600 экзэмпляраў, моцна, па-„нутраному", зьвязацца з шырокай масай працоўных жанчын.

Адзначаючы гэтыя дасягненьні Цэнтральны Камітэт КП(б)Б, разам з гэтым настойліва напамінае рэдакцыі часопісі, яго карэспандэнцкаму чытацельскаму актыву, тыя вялізарныя і адказныя задачы, якія высоўваюцца Камуністычнай партыяй перад пралетарскім друкам.

Кожным радком, кожным абзацам, часопісь павінна організоўваць, аб'яднаць масы працоўных жанчын навакол справы сацыялістычнага будаўніцтва, навокал рашучай барацьбы з адхіленьнямі ад ленінскай лініі, у першаю чаргу з правым апартунізмам, як найбольш небясьпечным у цяперашні момант, а таксама з левымі „загібамі" і рэцэдывамі трацкізму і прымірэнскімі адносінамі да іх, вакол пасьпяховага выкананьня пяцігодкі, узмацненьня тэмпу будаўніцтва, высоўваньне і падрыхтоўкі новых кадраў, сацыялістычнай перабудовы быту—навакол усяго таго, што складае генэральную лінію Камуністычнай партыі.

Часопісь павінна зьявіцца сапраўдным застрэльшчыкам уцягненьня ня толькі работніц, але і астатняй масы працоўных жанчын у сацыялістычным спаборніцтве.

Часопісь павінна організоўваць масы працоўных жанчын вёскі вакол пытаньня—каляктывізацыі вёскі.

Часопісь „Беларуская Работніца і Сялянка" пераходзячы з гэтага нумару поўнасьцю на беларускую мову павінна яшчэ ў большай меры дапамагаць рабочай клясе, яго Камуністычнай партыі ў справе ажыцьцяўленьня гегемоніі пролетарыяту ў адносінах да аснаўных мас сялянства і ў справе стварэньня культуры „нацыянальнай па форме і пралетарскай па зьместу".

Выхоўваючы масы працоўных жанчын у духу непрымірымай нянавісьці да клясавых ворагаў і рашучай барацьбы з імі, часопісь павінна ўзмацніць на сваіх старонках інтэрнацыянальнае выхаваньне працоўных, вядучы бязьлітасную і жорсткую барацьбу з шовінізмам (яўрэйскім, польскім, вялікадзяржаўным) і ў асаблівасьці з беларускім шовінізмам і нацыянал-дэмократызмам, найбольш небясьпечным на даным адрэзку часу і прымірэнчымі адносінамі да іх.

Часопісь „Беларуская Работніца і Сялянка" пасьпяхова справіцца з вялікімі і адказнымі задачамі, якія стаяць перад ёю, толькі пры тых умовах, калі часопісь шчыльна зьвяжыцца з самай шырокай масай работніц, батрачак, бяднячак, сераднячак, калгасьніц, дабіцца самага актыўнага ўдзелу і супрацоўніцтва ў часопісі актыву, гэтым неабходна кіравацца рэдакцыі ва ўсёй яе рабоце.

Гарачае вітаньне армейцу бальшавіцкага друку часопісі „Беларуская Работніца і Сялянка" ў дзень пяцігадовага юбілею.

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай Партыі (Бальшавікоў) Беларусі.

Наш товариський гарячий привіт.

Редакція журналу „Селянка України" від імени 20 тисяч читачок свого журналу—трудящих селянок України шле палке прывітання в день 5-х роковин своему сотоварищу по работі—журналу „Беларуская Работніца і Сялянка", його читачам і селькоркам.

В такий—знаменний день треба відзначити ту величезну творчу роботу, що 11 провадив журнал, невпинно закликаючи робітниць і селянок Билорусі до широкої участи в соціялістичному будівництві.

Висьвітлюючи на своїх сторінках питання п'ятирічного пляну перабудови всього народного господарства і зокрема перебудовы села на новий соціялістычний лад, питання колёктивізації, питання соціялістичного змагання, питання поліпшення побуту робітниць і селянок Білорусі—„Беларуская Работніца і Сялянка" с тим журналом, що оргонізовуе довкола виконання цих завдань широкі маси трудящих жінок Білорусі.

Хай же й надалі журнал „Беларуская Работніца і Сялянка" з такім же успіхом продовжуе велику справу збудження свідомости трудівниць Білорусі.

Хай же й надалі бореться він за остаточне розкріпачэння робітниць і селянок Білорусі, за утворення нового побуту вперто притягуючы тысячі трудящих жінок до участи в громадзькій роботі, до участи в нашому могутньому будівництві.

Редакція журналу „Селянка України".

Непаслабным тэмпам уперад.

Часопісі „Беларуская Работніца і Сялянка"—у дзень пяцігадовага юбілею пралетарскае прывітаньне ад Цэнтральнага Савету Прафсаюзаў Беларусі.

На працягу 5-ці год „Беларуская Работніца і Сялянка" праводзіла ў гушчу работніц дырэктывы нашай партыі, арганізуючы работніц навакол асноўных задач нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

ЦСПСБ цьвёрда ўпэўнен, што часопісь „Беларуская Работніца і Сялянка" неаслабным тэмпам будзе працягваць гэтую справу, што часопісь з кожным днём будзе ўздымаць новыя і новыя слаі работніц і сялянак на ажыцьцяўленьне пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва.

Прэзыдыум ЦСПСБ.



Абмяркоўваюць часопісь.

АБАВЯЗУЕМСЯ... ВЫКЛІКАЕМ

У зьвязку з пяцігадовым юбілеем часопісі „Беларуская Работніца і Сялянка“ Сьмілавіцкі раён уступіў у сацыялістычнае спаборніцтва на лепшую пастаноўку работы вакол часопісі і выклікае Пухавіцкі раён па наступным пунктам:

1. Кожнай ячэйцы правесьці ў маштабе сельсавету шырокую нараду чытачак, карэспандэнтак і ўпаўнаважаных па выпісцы часопісі і ўсіх грамадчыц па пытаньню аб пашырэньні выпіскі часопісі, працы вакол яе і сацспаборніцтва.

2. Распрацаваць пытаньне правядзеньня юбілею і сацспаборніцтва на ўсіх дэлегацкіх сходах, а таксама кожнаму дэлегацкаму сходу вылучыць упаўнаважаных па распаўсюджаваньню часопісі.

3. Правесьці сходы жанчын, у кожнай вёсцы, прысьвечаныя юбілею, дзе заслухаць справаздачы ўпаўнаважаных па распаўсюджаваньні часопісі і абраць упаўнаважаных у тых вёсках, дзе да гэтага часу ня было.

4. Завербаваць па раёну да 1-га студзеня ня менш як 1000 паўгадавых падпішчыкаў часопісі „Беларуская Работніца і Сялянка“.

5. Арганізаваць па раёну ня менш як 60 гурткоў „Прыхільнік часопісі „Беларуская Работніца і Сялянка“, для кіраўніцтва імі скарыстаць камуністак, камсамолак, настаўніц і грамадчыц. Працу ў гуртках распачаць не пазьней 10 сьнежня, у гурткі ўцягнуць ня менш 600 жанчын: савгасьніц, калгасьніц, батрачак, сялянак бяднячак і сераднячак.

6. Уцягнуць у рабсялькораўскі рух ня менш 40 жанчын з разьлікам на кожную ячэйку КП(б)Б ня менш 3-х чалавек.

7. Арганізаваць агляд працы вакол часопісі „Беларуская Работніца і Сялянка“, усіх хат-чытальнь, клюбаў і школ.

8. Пры кожнай насьценгазэце мець куток у якім высьвятліць працу гуркоў „Прыхільнік часопісі“ і ход распаўсюджваньня.

9. Правядзеньне юбілею пяцігодзьдзя выданьня часопісі „Беларуская Работніца і Сялянка“ скончыць к 1-му сьнежня.

10. 22 сьнежня склікаць райнараду ўпаўнаважаных па выпісцы, сялькорак і чытачак часопісі „Беларуская Работніца і Сялянка“, дзе паставіць пытаньне—праверка выкананьня ўмовы па сацспаборніцтву.

Дэлегаткі Фрунзаўскага раёну—„Беларускай Работніцы і Сялянцы“.

Урачысты сход дэлегатак—работніц і жонак рабочых Фрунзаўскага раёну, прысьвечаны выпуску дэлегатак шле палкае прывітаньне органу Аддзелу работніц і сялянак ЦК КП(б)Б часопісу „Беларуская Работніца і Сялянка“ ў яе пяцігадовы юбілей.

За пяць год свайго існаваньня „Беларуская работніца і Сялянка“ адыгрывала ролю арганізатара

Актывісткі за часопісьсю.

шырокіх мас работніц і працоўных сялянах у справе прыцягненьня іх да актыўнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве нашай краіны.

Вялізарная работа, якая праводзіцца зараз пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі рабочай клясы ў цеснай сувязі з бядняцка-серадняцкімі масамі сялянства па ажыцьцяўленьню пяцігадовага пляну, пляну будаўніцтва сацыялізму—патрабуюць высокай актыўнасьці масы работніц, батрачак, бяднячак і сераднячак у справе ўздыму вытворчасьці працы, сацыялістычным спаборніцтве, падняцьцю кваліфікацыі работніц, аб'яднаньню сельскай гаспадаркі ў буйныя калектывы, арганізацыі новага быту.

Усе гэтыя пытаньні павінны знаходзіць шырокі адбітак на старонках нашай часопісі.

„Беларуская Работніца і Сялянка“ павінна стаць зброяй для кожнай работніцы, батрачкі, сялянкі беднячкі і сераднячкі для барацьбы за пабудову сацыялізму.

Пяцігодзьдзе „Беларускай Работніцы і Сялянкі“ яшчэ больш замацуе цесную сувязь нашай часопісі з шырокімі масамі работніц і працоўных сялянак.

Пяцігодзьдзе яшчэ больш прасуне часопісь на ф-кі і заводы, у саўгасы, калгасы і вёску.

Дэлегаткі Фрунзаўскага раёну бяруць на сябе абавязак шырока прасоўваць „Беларускую Работніцу і Сялянку“ ў жаночыя колы, даць к 5-годзьдзю новых чытачак і селькорак часопісі.

Няхай жыве камуністычная партыя!

Няхай расьце і мацнее „Беларуская Работніца і Сялянка!“

Менск 14-XI—1929 г.

Прывітаньне нашай часопісі.

У 5-ю гадавіну „Беларускай Работніцы і Сялянкі“ шлю шчырую падзяку часопісі.

Чытаючы „Беларускую Работніцу і Сялянку“ я знаёмлюся з жыцьцём работніц Беларусі, вывучаю беларускую мову і з вялікім задавальненьнем чытаю адпавяданьні Галкі.

З вялікай зацікаўленасьцю я чытаю кожны нумар гэтай часопісі і раю ўсім батрачкам, сялянкам быць сталымі падпішчыкамі на „Беларускую Работніцу і Сялянку“.

Мяне прашу лічыць падпішчыцай на ўвесь 1930 г.

Горкі, Дошанскай акр. **Кацярына Шуко.**

ВЫРАСЬЦІМ КАДРЫ.

Пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі ў Савецкім Саюзе шпарка будуецца сацыялістычная гаспадарка.

За 12 год пралетарыят, у цесным саюзе з бядняцка-серадняцкімі масамі сялянства дасягнуў вялізарных посьпехаў у сацыялістычным будаўніцтве. Пабудованы і будуюцца магутныя электрастанцыі, мэталюргічныя заводы, заводы па выпрацоўцы машын для прамысловасьці, трактароў і іншых машын для перабудовы сельскай гаспадаркі. Пабудованы і будуюцца чыгункі, хэмічныя і іншыя заводы.

Небачаным дагэтуль тэмпам растуць калгасы. У Беларусі па пяцігодцы намячалася арганізаваць у першы год 360 калгасаў, арганізавана-ж іх каля 600. Зараз па Беларусі маецца 1713 калгасаў, а па ўсяму СССР 39350 калгасаў. Узрасла пісьменнасьць, культурнасьць рабочых і сялян. Палепшылася матар'яльнае становішча працоўных мас, ня гледзячы на перажываемыя цяжкасьці нашага росту.

15-ы Зьезд і 16 канфэрэнцыя УсеКП(б) вынясьлі рашэньня будаваць у першую чаргу буйныя мэталёргічныя заводы—індустрыялізаваць краіну, арганізаваць бядняцка-серадняцкія масы ў калгасы. Па 5-цігодцы ўкладваецца ў новае будаўніцтва 64 міліярды руб.

Першы год выкананьня пяцігодкі паказаў, што маючыйся ўздым творчай энэргіі рабочае клясы ў саюзе з асноўнай масай сялянства, стварае магчымасьць выканаць пяцігодку за чатыры гады.

Наша будаўніцтва накірована на зьнішчэньне кулака, нэпмана. Таму капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі супраціўляюцца нашаму разгорнутаму наступленьню, спрабуюць пашкодзіць, затрымаць шпаркі тэмп сацыялістычнага будаўніцтва.

Камуністычная партыя кліча і патрабуе ўдзелу працоўных жанчын у сацыялістычнай стройцы.

Камуністычная партыя, сваім кіраўніцтвам, цалкам забясьпечвае ўдзел працоўных жанчын у сацыялістычным будаўніцтве.

Камуністычная партыя цьвёрда праводзіць палітыку вылучэньня, вырашчваньня новых кадраў з шэрагаў рабочае клясы, батрацтва і бяднейшага сялянства.

Зараз у Саветах Беларусі працуе 8.429 жанчын. У апошнія перавыбары лік жанчын абраных у саветы павялічыўся на 6.766 чалавек. Старшынь сельсаветаў у 1927 годзе было толькі 14, а зараз іх ёсьць 122.

Куюцца кадры таксама ў нашых навучальных установах: У Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт у гэтым годзе прынята 176 жанчын, сельскагаспадарчую акадэмію—54, вэтэрынарны інстытут—27 чалавек. У розныя тэхнікумы прынята 1.096 жанчын, у рабфакі—116. А ўсяго ў вышэйшых навучальных установах Беларусі, тэхнікумах і рабфаках зараз—5.247 жанчын.

Ужо не адна сотня работніц, батрачак і бяднячак улілася ў ворганы кіраўніцтва будаўніцтвам. Ні адна сотня працоўных жанчын прапушчана праз розныя курсы, якія рыхтуюць кваліфікаваных працаўнікоў для вытворчасьці, трактарыстых, працаўнікоў сельсаветаў, прафсаюзаў, каапэрацыі.

Але ўсё-ж маючаяся вылучэньне жанчын недастатковае. Побач з замацаваньнем вылучаных раней у розныя галіны нашай работы, нам трэба каваць новыя кадры.

Для пасьпяховага выкананьня пяцігодкі нам патрэбны кадры, якія-б цьвёрда стаялі на чале сацспаборніцтва, барацьбе з шкоднікамі, клясавымі ворагамі, барацьбе за ўздым вытворчасьці працы, танную і лепшай якасьці прадукцыю, за каляктывізацыю.

т. Грэм—работніца Меншвэю, уступіла ў партыю.

Патрэбны кадры, якія-б дапамаглі Кампартыі арганізаваць шырокія колы працоўных жанчын для перабудовы бы у, кадры барацьбітоў з адсталасьцю, некультурнасьцю.

Нам патрэбны кадры вылучэнак на гаспадарчую, прафэсіянальную, савецкую, каапэратыўную і іншыя адказныя работы. Патрэбны кадры кваліфікаваных работніц у прамысловасьці: майстры, тэхнікі, інжынэры; арганізатары і кіраўнікі буйнай каляктыўнай гаспадаркі, спэцыялісты па жывёлагадоўлі, паляводзтву, гародніцтву, садаводзтву, птушніцтву і інш.

Фабрыкі, калгасы, савгасы, прафсаюзы павінны вылучыць з сваіх шэрагаў лепшых работніц, батрачак, савгасьніц, калгасьніц—вылучыць іх для таго, каб нашы тэхнікумы, унівэрсытэты кавалі гэтыя кадры з людзей адданых справе пралетарыяту.

Гэтыя кадры павінны пачаць рыхтавацца праз нашы лікпункты, школы дарослых, палітшколы, праз дэлегацкія сходы, праз вялізарную школу грамадзка-палітычнай работы.

Работніцы, батрачкі павінны даць з сваіх радоў сотні лепшых—у шэрагі Камуністычнай партыі. Тады мы яшчэ шпарчэй будзем будаваць сацыялізм, тады мы канчаткова пазбавімся ад чужых справе пралетарыяту, варожых людзей.

Кожная дэлегатка, актывістка, работніца, батрачка, бяднячка, калгасьніца павінна паставіць перад сабой задачу навучыцца кіраваць сацыялістычным будаўніцтвам.

Кадры павінны расьці, растуць і будуць расьці з шырокіх колаў работніц, батрачак, бяднячак, калгасьніц і лепшай часткі сераднячак—удзельнікаў сацыялістычнай стройкі пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі.

Бурава.

РАПАРТУЮЦЬ ГРАМАДЧЫЦЫ

т. Іофэ—старшыня местсавету.

Сорак.

На акруговую канфэрэнцыю груп беднаты сабралася 40 жанчын батрачак і бяднячак. Яны з напружанай увагай прыслухоўваюцца да пытаньняў, якія абгаварвае канфэрэнцыя: пяцігадовы плян, перавыбары саветаў, каляктывызацыя.

Усе іх выступленьні на канфэрэнцыі сьведчаць аб адным: Ідзем за партыяй, як перадавыя байцы за сацыялістычную перабудову нашай краіны, расьцем! Усе іх прамовы кажуць аб тым, што партыя за гэтыя гады выкавала вялікія кадры жанчын-грамадчыц, якія прымаюць актыўны ўдзел у вырашэньні ўсіх пытаньняў грамадзкага жыцьця.

— Трэба дамагчыся, каб батрачкі і бяднячкі—апора партыі, аказвалі ўплыў на асноўныя масы бяднячак і сераднячак па ажыцьцяўленьню задач будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне. Батрачкі і бяднячкі, якія працуюць у групах беднаты праз дэлегацкія сходы павінны дамагчыся правядзеньня ў жыцьцё рашэньняў сходу беднаты Вось што казалі ўдзельнікі канфэрэнцыі: Трэба ня толькі на сходы выклікаць, але даваць сталую практычную работу—заявілі батрачкі і бяднячкі.

— Добра працаваў наш дэлэгацкі сход і вось цяпер былая дэлегатка працуе старшынёй сельсавету. Дэлегаткі падпісаліся на пазыку індустрыялізацыі—кажа таварыш Пустышына з Бягомльскага раёну.

Усіх жанчын ахапіць лікпунктамі, абучыць іх грамаце, часьцей праводзіць сходы, а то ёсьць сялянкі, якіх кулакі спрабуюць запужаць, каб ня ішлі ў каляктывы.

Усё гэта яшчэ раз кажа аб росьце, аб клясавай сьвядомасьці батрачкі і бяднячкі.

Вось на трыбуне сябра сельсавету т. Гарашчуна, яна рашуча выказваецца супроць рэлігійнага дурману.

Нам трэба новыя школы, ясьлі і пляцоўкі для дзяцей, будзем іх будаваць, а без папа пражывем.

т. Мукавошчык—калгасьніца, сябра РВК уступіла ў партыю.

Пабудова каляктываў—вось што захапіла ўсіх дэлегатак канфэрэнцыі. Усе яны выказваюцца за рашучую барацьбу супроць кулацтва, якія спрабуюць перашкаджаць у стварэньні калгасаў.

У перапынку горача спрачаюцца дэлегаткі.

— Чужыя думкі ты кажаш цётка, цьвёрда заяўляе таварыш Мукавошчык сваёй суседцы. Вось кулакі запалохваюць адсталых жанчын, што на паноў будуць працаваць калгасьнікі, а мы ўсе добра ведаем, што няма паноў у калгасах. што бедняку ў калгасе лепш жывецца як на сваёй адналічнай гаспадарцы. Зараз наш Сьмілавіцкі раён увесь пераходзіць на суцэльную каляктывізацыю. 1500 няпісьменных ліквідуюць па нашаму раёну сваю няпісьменнасьць.

т. Жызьнеўская—загадчык савгасу.

Таварыш Мукавошчык бяднячка ўступіўшая ў шэрагі партыі, яна актыўна ўдзельнічала ў арганізацыі калгасу ў вёсцы Запольле. Старшы сын яе камсамолец, а трое астатных—піянэры.

Такіх як Мукавошчык многа.

Сотні і тысячы работніц, батрачак і бяднячак упарта вядуць барацьбу за чарамогу новага жыцьця, новага быту шырокіх працоўных мас.

Батрачка—кіраўнік савгасу.

Жызьнеўская Марына пашла батрачыць яшчэ маленькай дзяўчынкай—8 год. 12 гадоў працавала Марына батрачкай. Пасьля Кастрычнікавай рэвалюцыі яна прымае ўдзел у грамадзкай працы. У 1919 г. яна ў час акупацыі за грамадзкую работу была арыштавана белапалякамі. Ледзь вырваўшыся з рук белапалякаў Марына адразу добраахвотна ўступае ў шэрагі Чырвонай арміі.

Больш двух гадоў на фронце, а пасьля зноў Жызьнеўская ідзе працаваць работніцай савгасу і адначасова яе выбіраюць старшынёй рабочкому. У 1924 годзе яна ўступіла ў шэрагі партыі. У 1925 г. таварыш Жызьнеўскую вылучаюць раённым інструктарам ЦП Саюзу Працзямлесу.

У верасьні 1929 году таварыш Жызьнеўская вылучаецца на гаспадарчую работу—Кіраўніком савгасу „Вішнеўка“, Менскай акругі.

Савгас нявялікі: працуе ў ім 16 рабочых. Зямлі 300 гэктараў.

Энэргічна бярэцца Жызьнеўская за работу. Трэба паляпшаць гаспадарку: павялічана стада кароў з 28 штук да 40, пабудавана павець над лакамабілем, старая запазычанасьць у 5 тысяч рублёў пагашана. Кватэры для рабочых адрэмантаваны, наладжана сыстэматычная выплата зарплаты.

Адносіны да вылучэнкі з боку рабочых добрыя.

Зараз таварыш Жызьнеўская паслана на 3-х месячныя курсы кіраўнікоў савгасу. **Р.**



Дэлегаткі батрачкі—прымацованыя да с.-савету.

КОЖНАЯ РАБОТНІЦА ПАВІННА АЎЛАДАЦЬ БЕЛАРУСКАЙ МОВАЙ.

Кіруючая роля ў сацыялістычным будаўніцтве нашай краіны належыць рабочай клясе, якая пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі вядзе за сабой аснаўныя масы сялянства.

Ленін кажа, што „Вышэйшы прынцып дыктатуры гэта—захаваньне саюзу пралетарыяту з сялянствам, каб пралетарыят здолеў-бы ўтрымаць кіруючую ролю і дзяржаўную ўладу“.

У Беларусі пераважная частка працоўных карыстаюцца беларускай мовай. Сярод насельніцтва БССР мы маем 80,6 проц. беларусаў, а калі ўзяць вясковае насельніцтва, то там 89,1 процанта беларусаў, у пераважнасьці сялян.

Каб ажыццяўляць пралетарскае кіраўніцтва вёскай, замацоўваць саюз рабочае клясы з асноўнымі масамі сялянства, пасьпяхова весьці сацыялістычную перабудову вёскі, неабходна, каб усе рабочыя і работніцы Беларусі карысталіся беларускай мовай, вывучалі-б гэту мову. Калі-б кіраўнік сялянства пралетарыят ня ведаў мовы гэтага сялянства больш цяжкасьцяй было ў справе сацыялістычнага будаўніцтва. **Пагэтаму больш пасьпяховым наша сацыялістычнае будаўніцтва будзе тады, калі ўся партыя бальшавікоў, увесь пралетарыят Беларусі аўладаюць беларускай мовай.**

Такім чынам сэнс беларусізацыі заключаецца ў узмацненьні дыктатуры пралетарыяту, у замацаваньні саюзу рабочае клясы з працоўным сялянствам. Справа ня толькі ў тым, каб фармальна вывучыць беларускую мову і на гэтым спыніцца. Сьвядомы рабочы і работніца ніколі так пытаньня ня ставяць, бо беларуская мова ў руках рабочае клясы зьяўляецца сродкам узмацненьня пралетарскае дзяржавы і таму трэба ня толькі вывучыць мову, але і карыстацца ёю ў сваёй рабоце.

Беларуская мова кожнаму рабочаму і работніцы патрэбна і для таго, каб забясьпечыць шпаркае разьвіцьцё беларускае пралетарскае культуры, каб панесьці гэтую культуру ў вёску, якая гаворыць на беларускай мове. Пралетарская культура, якая прасоўваецца ў шырокія масы працоўнага беларускага сялянства становіцца зразумелай і блізкай сялянству на беларускай мове. Незалежна ад таго расійскі, ці украінскі, яўрэйскі, польскі пралетарыят стварыў літаратурны, мастацкі альбо драматычны твор, калі ён будзе перакладзен на беларускую мову, тады ён дасягне сваёй мэты ў справе клясавага і культурнага выхаваньня рабочага і селяніна, гаворачага на беларускай мове.

У будаўніцтве беларускай пралетарскай культуры прымаюць удзел усе рабочыя, усе працоўныя Беларусі, незалежна ад таго ці зьяўляецца для іх беларуская мова роднай ці не, ці гавораць яны ў даны момант на беларускай мове ці не. Перад намі неаднакладная задача: беларусізаваць (гэта значыць навучыць карыстацца беларускаю моваю), уцягнуць у будаўніцтва беларускай пралетарскай культуры ўсіх рабочых і работніц.

Беларусізацыя зьяўляецца магутнай зброяй у барацьбе з нацыянал-дэмакратызмам, паколькі нацыянал-дэмакраты імкнуцца захапіць у свае рукі будаўніцтва беларускай культуры з тым, каб зрабіць зьмест гэтай культуры буржуазным, а не пралетарскім.

Сярод паасобных больш адсталых рабочых і работніц беларусізацыя выклікае непаразуменьні. Яны не



Вучымся.

ўсьвядомілі сабе вялізарнае значнасьці беларускай мовы ў справе разьвіцьця беларускай пралетарскай культуры, у справе ўзмацненьня саюзу рабочае клясы з сялянствам і таму ім не зразумела вялікае значэньне беларусізацыя рабочае клясы. Савецкая ўлада ня ўжываючы мэтадаў прымусу пры ўвядзеньні беларусізацыі рабочых, як гэта яна робіць у адносінах супрацоўнікаў дзяржаўнага апарату; дзяржаўны апарат абслугоўвае ўсіх працоўных і пагэтаму кожны супрацоўнік гэтага апарату павінен абслугоўваць працоўныя масы беларускага насельніцтва на яго роднай мове. Але ўсім рабочым незалежна ад іх нацыянальнасьці павінна быць яскравым вялізарнае значэньне беларусізацыі ў сацыялістычным будаўніцтве. **Гэтым мы ўзброім усіх рабочых зброяй, уладаючы якой пралетарыят Беларусі кіруе асноўнымі масамі сялянства ў барацьбе за сацыялізм супроць кулака, нэпмана і іх ідэолёгаў нацыянал-дэмократычна-буржуазнай інтэлігенцыі**

Вось чаму кожная работніца павінна аўладаць беларускай мовай.

Гаруновіч.

„Трэба найхутчэй выкрываць нашы слабасьці і памылкі, якія яшчэ ня выкрыты, але якія бясспрэчна існуюць. Але зрабіць усё гэта немагчыма без разгортваньня самакрытыкі, без узмацненьня самакрытыкі, без уцягненьня мільённых мас рабочае клясы і сялянства ў справу выяўленьня і зьнішчэньня нашых слабасьцяй, нашых памылак“.

СТАЛІН.

Зьезд ударнікаў.

Сацыялістычнае спаборніцтва шырока разгарнулася па ўсіх прадпрыемствах і пачынае пранікаць у вёску. Рабочыя, работніцы, калгасьнікі, бядняцка-серадняцкія масы сялянства ўступаючы ў спаборніцтва падпісваюць сацыялістычныя дагаворы, у якіх бяруць абавязак выканаць з правышэньнем намечаны кампартыяй і савецкай уладай пяцігадовы плян разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры.

Лепшая частка рабочых і работніц, найбольш аданая сацыялістычнай вытворчасьці, арганізуе ўдарныя брыгады, якія бяруць на сябе абавязак быць прыкладам перад усімі рабочымі і паказаць такую працу, якая можа цалком забясьпечыць добрае правядзеньне сац. спаборніцтва.

Ударнікі швэйнай ф-кі „Кастрычнік" абмяркоўваюць кандыдатуры на зьезд ударных брыгад.

У верасьні—кастрычніку г. г. праводзілася па ўсім прадпрыемствам і саўгасам праверка выкананьня сацыялістычных дагавораў. Гэтая праверка паказала, што ўдарныя брыгады адыгралі вялікую ролю ў правядзеньні сацыялістычнага спаборніцтва. Вось некалькі прыкладаў:

У маі месяцы на фабрыцы „Чырвоная Бярэзіна" (Барысаў) у зьемальным цэху арганізавалася ўдарная брыгада з 46 работніц. Ужо ў першым месяцы свайго існаваньня брыгада пачала выпрабляць на 4 проц. больш астатніх работніц, у другім месяцы брыгада давала на 7,5 проц. больш выпрабаткі, у 3-м на 11 проц., у 4-м на 16 проц. Астатнія работніцы ўбачыўшы такія посьпехі пачалі далучацца да брыгады. Брыгада выросла за 3 месяцы ўдвое, а ў верасьні месяцы ўвесь цэх, у колькасьці 380 работніц увайшлі ў брыгаду і зрабілі ўжо ўдарны цэх. Гэты ўдарны цэх пачаў патрабаваць лепшую якасьць працы ад іншых цэхаў і гэта прывяло да таго, што і ў іншых цэхах таксама пачалі арганізоўвацца ударныя брыгады. А калі падлічылі вынікі гаспадарчага году, аказалася, што сабекошт прадукцыі панізіўся на 8 проц., вытворчасьць працы ўзьнялася на 17 проц., а якасьць сярнічак палепшылася.

На папяровай фабрыцы „Гэрой Працы" ў ударных брыгадах удзельнічае 465 чал. У выніку іх працы ўся фабрыка добра праводзіла сац. спаборніцтва і калі падагулілі працу ф-кі за год аказалася, што вытворчая праграма выпаўнена на 42 проц. звыш пляну, вытворчасьць працы рабочых і работніц выросла на 47%, прагулы зьменшыліся ў 3 разы і г. д.

Такіх прыкладаў маецца шмат і яны сьведчаць аб тым, што ўдарнікі актыўна працуючы ў ударных брыгадах, зьяўляюцца застрэльшчыкамі лепшага правядзеньня сацспаборніцтва, сваім працоўным уздымам дапамагаюць выконваць лёзунг рабочых перадавікоў: „Выконваць 5-годку ў 4 гады".

Брыгады прапрацаваўшы некаторы час, накапілі значны вопыт у працы. Неабходна гэты вопыт распаўсюдзіць сярод усіх рабочых і работніц.

Для гэтай мэты УсеЦСПС склікае на 5 сьнежня Ўсесаюзны Зьезд ударных брыгад.

Па ўсёй Беларусі, як і па ўсяму Савецкаму Саюзу праводзіцца падрыхтоўка да зьезду ўдарнікаў. Праводзяцца фабрычна-завадзкія, акруговыя, а месцамі (Барысаў і Рэчыца) раённыя зьезды ўдарных брыгад. Праводзяцца даклады, гутаркі з усімі рабочымі і работніцамі аб значэньні ўдарных брыгад. Лепшыя ўдарнікі выбіраюцца на зьезды, многія прэміруюцца за добрую работу.

Падрыхтоўка да зьезду павінна выявіць ня толькі посьпехі ў працы ўдарнікаў, але і тыя цяжкасьці, якія сустракаюцца ў іх працы. Маецца шмат прыкладаў, калі ўдарныя брыгады раскідаюцца па тым прычынам, што партыйныя, профсаюзныя і камсамольскія арганізацыі не аказваюць ім дастатковай дапамогі ў працы. Маюцца асобныя факты, калі бюракратычныя элемэнты з асобных адміністратараў, незразумеўшых значэньня ўдарных брыгад, ня толькі не садзейнічаюць, а перашкаджаюць ударнікам у працы.

Зьнішчыць такія недапушчальныя зьявішчы, растлумачыць усім рабочым і работніцам значнасьць ударных брыгад, уцягнуць у шэрагі ўдарнікаў шырокія масы рабочых і работніц. Вось чаго неабходна дамагчыся ў час падрыхтоўкі да зьездаў ударных брыгад.

М. Ша.



т. Турэцкая—накладчыца друкарні.

ДРУКАРЫ

Там, дзе друкуецца „Беларуская Работніца і Сялянка“.

Драбнюткімі слупочкамі цынку запоўнены касы [1]). Над імі ўрады пастроіліся рабочыя, работніцы. Мільгацяць звычныя рукі, бы зерняты дзяўбуць—мэханічна кідаюць літары з касы ў вярстатку.

О, гэтыя рукі звычныя, ведаюць сваю справу здаецца, што вочы



Тав. Ліўшыц – накладчыца друкарні— уступіла ў партыю.

маюцца ня толькі ў ілбу, а ў кожным пальцы. Беспамылкова рука трапляе патрэбную літару, дробненькія кавалачкі цынку складаюцца ў словы, радкі, старонкі, машына перадае іх паперы, і ўжо з-пад машыны вырастаюць горы часопісаў, газэт, падручнікаў, мастацкай літаратуры, разьлятаюцца на фабрыкі, заводы, у калгасы, вёскі, школы; вучаць, заклікаюць, арганізуюць.

Ці сапраўды-ж мэханічна лятаюць рукі?

Не. Яны выконваюць загад класавай сьвядомасьці. Імі кіруе ўпартае імкненьне дагнаць і перагнаць.

Зараз 1-ая дзяржДрукарня правярае вынікі сацыялістычнага спаборніцтва, у якое ўступілі па выкліку Палесдруку.

Уступаючы ў сацыялістычнае спаборніцтва, рабочыя ўзяліся: падняць вытворчасьць працы на 17%, зьнізіць сабекошт прадукцыі на 5% і многа другіх абавязкаў узялі на сябе.

Праверка выкананьня сацдагавору паказала, што сапраўды вытворчасьць працы ўзьнялася на 20,74%, сабекаштоўнасьць зьніжана замест намечаных 28.018, на 30.561 рубель,—ці на 6,58%. У гэтай частцы дагавор перавыкананы.

Рацыяналізацыяй, боем па прагулам, спазьненьням на работу, інтэнсыўнасьцю самой работы— вось чым дамагліся такіх дадатных вынікаў.

— Ушчыльнім рабочы дзень, зьнішчым непатрэбныя разгаворы ў час работы, сацдагавор павінны мы выканаць—заклікалі перадавыя рабочыя.

У 2-х цэхах утварыліся ўдарныя брыгады. Паступіла некалькі выклікаў між рабочымі ўнутры прадпрыемства.

Пачын швецаў.

Пераплётны цэх доўга не адважваўся між станкамі спаборнічаць.

— У нас дзень досыць ушчыльнены. Будзем так выконваць агульны дагавор, без індывідуальнага спаборніцтва.

Але вось, між другімі машынамі--„машына Роккінд Цылі“, як называюць яе некаторыя рабочыя таму, што звычайна за гэтай машынай прывыклі ўсе бачыць толькі яе, Цылю.

Цыля 18 год працуе на вытворчасьці. Абставіны змусілі яе 11 гадовай дзяўчынкай пайсьці ў друкарню, тады яшчэ капіталістычную, — стаць к станку. За поўчалавека ўлічвалі гэтага дзіцёнка; разам яшчэ з адным хлапчуком яны лічыліся адзінкай на вытворчасьці.

Але час той даўно мінуў. Зараз Цыля—сябра партыі. Яна добра памятуе, выказвае кожным рухам сваім, што працуе за тым самым станком, але ня тым, бо станок, як і ўсё прадпрыемства—прыналежыць рабочай клясе. А Цыля і сама—работніца.

Цыля першая сьмельчачка па пераплётным. Яна першая напісала ў заўком:

—*„Зьніжаю расцэнкі на блянкавых кнігах у 1—2 дзесьці на 10%, бяруся зьнішчыць брак, трымаць у чыстаце машыну і выклікаю на сацыялістычнае спаборніцтва работніц—Гольдман, Дварэцкую, Бродкіну і Шэйн“.*

Гольдман прыняла выклік і дадала:

— *„Зьніжаю расцэнку на блянкавых кнігах у 1 дзесьць на 25%, а ў 2 дзесьці—на 15%“.*

Прынялі выклік і астатнія швецы.

Раней матар'ял чарнарабочы дзе папала скідаў, а швецам прыходзілася адрывацца ад машыны, бегаць, шукаць матар'ял, зараз



Тав. Хоруц лінатыпістка друкарні.

*) Скрынкі, з перагародкамі, у якіх знаходзяцца літары.

прад'явілі трэбаваньне адміністрацыі, каб матар'ял быў каля машыны ў дастатковай колькасьці.

Закруціліся колы машыны. Постаці, нярухомыя толькі рукі шпарчэй замігалі, а над імі ўзьлёты белых крыльляў вялізарных кніг.

Швецы выйшлі пераможцамі.

Да ўступленьня ў сацспаборніцтва, кожная ў сярэднім выраблыла па 800 аднадзесьцевых кніг у дзень, а зараз звыш 1000. Расцэнка зьніжана, а заработак ня зьменшыўся.

Побач з швецамі, на канвэртах Пукшанская працавала. Узялася і яна спаборнічаць. Урэшце заявілася ў фабком:

—*„Зьніжаю расцэнку на 15%, вытворчасьць працы павялічыла на 50%“.*

Пасьпяхова выканалі саўдагавор, з вялікім захапленьнем дапамагаюць індустрыялізацыі краіны.

Работніцы друкарні падпісаліся на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на 2.830 рублёў.

Клапацяцца аб абароне краіны. Нядаўна на самалёт сабралі 95 р. 85 кап.

Не бяз выдадка.

—Завялася ў стадзе паршывая авечка,—гавораць работніцы друкарні, успамінаючы карэктаршу—Варатынскую.

Карэктарскае аддзяленьне пашло за рабочымі друкарні. Дагавор выканаць дапаможам — парашыла карэктарскае, і ўсё аддзяленьне цалкам павялічыла норму на 5000 літараў кожны.

Усе... за выключэньнем адной Варатынскай. Гэта яна адна ў разрэз з усім каляктывам адмовілася падпісаць дагавор.

Што кіравала ёю?

Што ўгодна, толькі не несьвядомасьць.

Плюсы і мінусы.

Вось у гэтай самай друкарні майструецца часопісь „Беларуская Работніца і Сялянка“. Праходзіць яна праз дзесяткі рук рабочых і работніц, праз некалькі машын, і пасьля разьлятаецца па ўсёй Беларусі, трапляе ў Маскву, Ленінград, на Украіну і нават к работніцам Нямеччыны, Балгарыі, Амэрыкі. Чытаюць яе і самі друкарніцы — 180 работніцяжонак рабочых друкарні--падпішчыцы на „Беларускую Работніцу і Сялянку“.



Тав. Рохкінд—работніца друкарні выклікала на сацспаборніцтва швецаў.

Работніцы друкарні чытаюць, вучацца, растуць. Зараз сярод іх 42 дэлегаткі, партыйнай і совпартшколай ахоплена 22 работніцы. У гэтым годзе ў партыю ўступілі 4 работніцы. Ня так даўно работніца Хоруц вылучана лінатыпісткай.

Але гэта толькі адна Хоруц. Наогул-жа па друкарні з вылучэньнем кепска. За апошні год ніводнай работніцы ня вылучана на кіруючую работу. З боку майстраў і нават часткі рабочых не здаровыя адносіны да вылучэньня работніц на больш кваліфікаваную работу. Парткаляктыў таксама пакуль нічога рашучага ў гэтым напрамку не зрабіў.

Нядаўна ў лінатыпнае аддзяленьне пастаўлены 3 вучні, з іх ніводнай работніцы.

Работніцы друкарні тав. Карп і тав. Пукшанская.

Сярод накладчыц ёсьць старыя работніцы, якія гадоў па 20—друкарамі. Ня раз узьнімалася пытаньне аб тым, каб старых накладчыц замацаваць стала за машынамі, каб прывучаліся спачатку да работы накладчыц з прыпраўкай, а пасьля і далей. Але ёсьць у друкарні такія, якім ня люба гэта.

— Майстраў зьнімаць будзеце, а работніц на іх месца ставіць,— супярэчаць яны.

Ды навошта зьнімаць? Нам навучыцца трэба, а пасьля відаць будзе.

Упарта супярэчаць майстры. А быў нават такі выпадак.

Старая работніца Левіт—накладчыца. Майстра ня было пры машыне. Не стаяць-жа, не чакаць майстра рукі склаўшы. Кожная хвіліна прастою—страта прадпрыемству.

Таварыш Левіт 2 гадзіны з гакам прапрацавала, зрабіла палову прыпраўкі. Старшы—суровы Кац наскочыў.

— Ня лезь ня ў сваю справу,— закрычаў ён, сарваў усё пад ногі, падмяў 2 гадзіны працы таварыш Левіт, спробу не дапусьціць прастою.

Вось такіх Кацаў трэба коцнуць пралетарскай самакрытыкай, каб добра запамяталі яны, што працуюць на савецкім прадпрыемстве.

Парткаляктыву, прафарганізацыі і ўсім рабочым трэба ад слоў да справы перайсьці—практычна вырашыць пытаньне вылучэньня на кіруючую працу і павышэньня кваліфікацыі работніц. **В. Х.**

Менск 1-ая друкарня.

Алё... Алё...

Слухайце нашу перадачу часопісі „Беларуская Работніца і Сялянка“ ў нядзелю 8, 15, 22 і 29 сьнежаня ў 7 гадзін вечару.

Работніцы, батрачкі, бяднячкі і сераднячкі.

Пішыце, ці падабаецца вам гэта перадача!



Мацней каханьня.

(Аканчаньне).

Апавяданьне
Н. І. Ільліной.

Капітоніха як і іншыя працавалі на дванаццаці матальных фігурках.

Вольга бачыла як старая пільна аглядала кожную намотку, папраўляла памылкі.

„У гэтай рукі залатыя,—падумала яна пра Капітонаву:—старая, хворая, а ў рабоце першая".

Дзяўчына аглядзела ўвесь цэх. Работніцы шпарка станавіліся на сваё месца, згінаючы сьпіны над матавіламі. І тут Вольга сказала сабе:—„Устарэлі нашы машыны, трэба замяніць іх больш зручнымі".

Думкі востра круціліся ў галаве Вольгі; у тый-жа час звычнае вока дзяўчыны нясупынна сачыла за работай. Вось абарвалася нітка. Вольга лоўка падхапіла канцы і спрытныя пальцы яе ў адзін момант наладзілі бязупынны паток пражы.

Але вось з прасьветленым тварам Вольга разагнула сьпіну. Вочы яе пад сагнутымі брывамі заблішчалі надзвычайна. Упершыню Вольга адарвалася ад станка ў разгар працы.

— Цёця Капітонава!—сказала яна, падышоўшы да старое:—што я толькі надумала... Такое надумала, што ай-яй-яй!..

Старая работніца зьдзіўлена паглядзела на разружаваны твар дзяўчыны.

— Што здарылася?—загаварыла яна.

— Здарылася нешта,—загадачна ўсьміхнулася Вольга:—я ўжо к табе дамоў забягу, там усё і выкладу... А пакуль адно скажу—вялікая палёгка ў рабоце ў нас можа быць.

* * *

Акоціца, дзе жыла Капітоніха, выглядала маленькім гарадком. Тут блізка пачыналіся палі, іх прывабнае дыханьне чарназёма і зазелянеўшай вярбы даносілася да Слабодкі.

Вольга гучна стукнула клямкай, вайшла ў двор. У вокнах, дзе жыла Капітоніха, мільгацеў сьвет.

У Капітоніхі ў гасьцях сядзеў майстар матальнага аддзяленьня з жонкай ткачыхай. Яна вальготна прыладзілася за сталом. Пілі гарбату.

Давайце аб справах пагаворым—запрапанавала Вольга.—У мяне ў галаве нібы вароньне гняздо завялося: „кар ды кар", спакою няма.

— Няўжо?—сьмешкаю запытаў майстар:—Мо каханьне супакою не дае?

— Неўгадаў,—засьмяялася Вольга,—па другому галава трашчыць.

— Калі аб другім, выкладывай у голас,—папрасіла Капітоніха.

Вольга аглядзела ўсіх мяккімі вачыма.

— З тэй вытворчай нарады пачалося гэта са мною,—загаварыла яна ўпаўголас:—хаджу, як з пахмельля, у галаве-ж: „Ражым эканоміі, рацыяналізацыя"... Ну, думаю?—жыва ня буду, а што-небудзь сваё ў гэту справу абавязкова ўкладу.

— М... што-ж?—крыху насьмешліва запытаў майстар.

Вольга насьмешку злавіла і крута падняла галаву.

— Асобага, вядома, нічога,—сказала яна:—дзе ўжо нам, бабам да вас, мужыкоў.

Капітонаўна пецярнёю зграбла патлы на галаве майстра, жартуючы стала трапаць іх.

— Сьмешак ня ладзь, чорт стараражымны.

Ткачыха пакасілася на мужа, бурчліва прагаварыла:

— Яны, толькі аб сабе і думаюць... Нібы індыкі: „лепш нас і птушкі няма на зямлі".

Усьміхаючыся, яна дадала:

— Няхай пацяшаюцца, а мы свайго ня кінем.

— Вось, гэта так,—падхапіла Капітоніха, штурхнула ў плячо Вольгу:—расказвай, золатца, што там у цябе.

Вольга, падзіцячы выгінаючы ніжнюю губу, пачала, зварочваючыся да Капітоніхі:

— Цёця Капітоніха, я прыдумала палепшаньне к станкам... Як ты думаеш, ці можна перарабіць машыны-з ніжніх фігурак на верхнія?..

— Вось яна аб чым сумуе!..—ускрыкнуў майстар і зацокаў языком.

— Пачакай дурашнічаць!—абарвала яго Капітоніха: — дзеўка здаецца справу гаворыць. Як патвоему, а?..

Майстар памаўчаў, пажаваў губамі і ўрэшце зусім сур'ёзна прагаварыў:

— Прапанова ваша, Вольга Ярмалаеўна, някепская. Каб зрабіць гэта, работніцам будзе лягчэй, і для фабрыкі ашчадней, рвані менш будзе... Але толькі я проста скажу,—выдумка ваша не навінка... Дзе кольвек ужо перарабілі так станкі матальныя.



За работаю на ф-цы „Чырвоны Тэкстыльшчык" (Менск).

—Няўжо?—зьдзіўлена запытала дзяўчына:—Чаму-ж дагэтуль я нідзе ня чула пра гэта?..

— Факт! — абазваўся майстар.

— Чаму-ж ты, голубе, дагэтуль мочкі сядзеў з сваім фактам?—накінулася на майстара Капітоніха:—ці сьвядома-ж рабіць так, а?

І да Вольгі:

— А ты чаго адбой даеш?

Сама абмазгавала — да канца справу давесьці трэба. Далажы на вытворчай нарадзе, а я гарою пастаю за гэта: перарабляйце машыны, і—усё.

Ткачыха ўважліва праслухоўвалася да гутаркі, пасьля жвава загаварыла, углядаючыся ў адлегласьць:

— Я таксама працавала ў матальным і скажу проста: твая прапанова, Вольга адразу работу палепшыць.

Вольга здаволена ўсьміхнулася.

— Што-ж, — абазваўся і майстар—давай, Вольга Ярмалаеўна, ў чацьвер на вытворчай нарадзе абмяркуем... Да заадно мой плян...

Вольга глянула на яго.

— Які плян? Выкладай,—папрасіла Капітоніха.

Майстар махнуў рукою.

— Простая справа ў мяне... Зрабіць лічу трэба для кожнай матальшчыцы раму для зьёмаў... Вось...

— Гэта, што яшчэ?—зьдзівілася Капітоніха.

Вольга жыва кіўнула галавою.

— Ага, зразумела,—абазвалася яна:—гэта для таго, каб матальшчыцы не адрываліся ад работы, заўсёды мелі пад рукою пустыя катушкі, а намотаныя, каб ня кідалі на падлогу, а адразу на сьпіцы нізалі. Так?..

— У самую мэту—абазваўся весела майстар.—Малайчына дзяўчына...

Капітоніха рукамі разьвяла.

— Ды як-жа гэта так? Усе людзі што кольвек прыдумляюць, а я ні ў зуб штурхануць.

Усе засьмяяліся.

Але ўрэшце Вольга пацямнела, трывожна запытала:

— А як-жа тады з вязальшчыкамі будзе?

Майстар працяжна сьвіснуў.

— З вязальшчыкамі? З імі размовы кароткія; рамы—на месца, а іх за парог. Нічога ня зробіш.

Вольга насупіла бровы, пачырванела.

— А я, таварышы, думаю,— няўпэўнена сказала яна, — рамы гэтыя ніякай карысьці нам не даюць.

Капітоніха выпытваючы зірнула на яе і заківала галавою.

— Дура ты пасьля гэтага— вось што я табе скажу. Ты прыкінь добранька мазгамі!..

Вольга адразу ўсё прыкінула: вядома, рамы, прыдуманыя майстрам, ці мала ўпрасьцяць работу матальшчыц і дадуць ашчаду на штаце. Але што тады будзе рабіць яе любы Гарасім? За парог— і ўсё дык няўжо і ёй трымацца за гэтыя рамы?

„Што тут рабіць?“ — думала Вольга. Зварочваючыся дамоў, яна няпрыкмячала прыгоды вясеньняй ночы: „Падтрымаць майстра—ісьці супроць лёсу Гарасіма. Абараняць Гарасіма — ісьці супроць фабрыкі, супроць таварышоў, супроць агульнай справы“.

Путаючыся ў гэтым пераплёце думак і пачуцьцеў, не знаходзячы выхаду, пэўнага, Вольга шукала гэтага выхаду да самага дню выдворчай нарады.

* * *

У нізкім пакойчыку пахне машынным маслам і яшчэ нечым падвальным. На новых, нядаўна адструганых, лаўках яшчэ пуста. Але вось рыпнулі дзьверы, з пакункам у руках вайшла Капітоніха.

Як заўсёды, у хустачцы на вочы зьёхаўшай, вайшла Вольга. Капітоніха пасунулася да стала, узяла ліст паперы, вывяла на ім сваё прозьвішча і крыкнула:

— Падходзь!

Каля яе стварылася чарга.

Нарада адчынілася з спазьненьнем. І як толькі адчынілася, Вольга ўбачыла каля дзьвярэй Гарасіма: шапка спаўзла на патыліцу і цёмны чуб з-пад яе стырчаў малайцавата і задорна.

Вользе зрабілася неяк сумна і неспакойна. Нешта войстрае засмактала сэрца. Сёньне, вось тут, вырашыцца яе лёс: ці выступіць яна, Вольга, супроць прапаноў майстра і гэтым абароніць Гарасіма, ці паслухае голасу сумленьня—будзе галасаваць за ўстаноўку рам... Але тады—бывай каханьне. Бо яе словы назаўсёды адштурхнуць любімага чалавека.

Вольга пагрузла ў свае думкі, незаўважвала што робіцца наўкола.

— А што ты, нібы апараная?— штурхнула яе ў бок Капітоніха:— ачніся. Ужо хутка табе прыходзіцца дакладваць.

— Ай, Капітоніха,—прыхілілася Вольга да пляча старое:—разладзіца ў мяне ўнутры... Парай, як быць? Вось ён тут—Гарасім. Ці адважуся я за яго скарачэньне руку паднімаць? Няхай іх—гэтыя рамы...

Капітоніха колка зазірнула ў вочы Вольгі. Пасьля горка хвалюючыся ціхенька прагаварыла:

— Што-ж дзяўчынка, відаць ад цябе іншага не чакаць!.. Толькі падумай пасапраўднаму: з чаго ты сваё шчасьце выкрайваеш? Глядзі, не пакайся пасьля.

Капітоніха сурова змоўкла і адсунулася. Вольга зьбялела, вочы яе запалі і патухлі. І вось, нечакана, думкі яе зварухнулі ўсё мінулае. Увосень, дваццатага году прывезьлі мёртвага бацьку яе з фронту. Калі хавалі яго, нехта сказаў над магілаю: „Памёр сам, затое фабрыку адстаяў“.

Успамянуўшы гэтыя словы, Вольга зубы сьціснула, шаптала: „Што-ж я сапраўды? Няўжо адхілюся ад фабрыкі? Татка жыцьця не пашкадаваў, а я за асабістую ўгоду палкі ў кола стаўлю“.

Хруснулі пальцы, распрасталася і жорстка ўсьміхаючыся кіўнула галавою Капітоніне: „Не палохайся, усё добра будзе!“.

Наўкола весела. ўзбуджана гулі людзкія галасы. Калі дайшла да яе чарга, Вольга спакойна падышла да стала, падабрала пад хустку цёмныя валасы, і пачала:



Найвялікшая ў сьвеце ткацкая фабрыка пабудована ў Івана-Вазьнясенску.

— Мая прамова—кароткая. Я доўга думала як, палепшыць нашу работу. Мы гнем сьпіны над матальнымі фігуркамі, стамляемся і работа ня спрытна. Я прапаную перарабіць матальныя машыны з ніжніх фігурак на верхнія... Як вырашыце, так і быць павінна.

Яшчэ Вольга прамовы ня скончыла, як устала востравокая Нюша.

— Я супроць выказваюся—крыкнула яна.—Вельмі разумная стала дзеўка... Бачыш ты, інжынэр які. Як пазвыкалі працаваць, так і будзем. Няхай-бы Вольга лепш аб прыбаўцы заработку нам паклапацілася.

Узьнялі шум. Адны былі за Нюшу, другія за Вольгу. Вольга бачыла як Нюша, паказваючы на яе пальцам нешта шаптала Гарасіму, а той адабраючы галавою ківаў. Пасьля Гарасім прыклаўшы рукі дудаўкаю да роту, на ўвесь пакой закрычаў:

— Знайшлася вынаходчыца!

Вольга ўздрыганулася, чырвоныя плямы выступілі на яе твары.

— Цішэй, чаго галдзіце—супакойвала Капітоніха. Яшчэ не спрабавалі, а лаеце. Пазвыкэлі абы як. Вас к добраму цягнуць, а вы за спекло старое. Вольга справу прапануе на нашу-ж карысьць. Для фабрыкі лепш—рвані менш, і нам—выпрацоўка павялічыцца.

Спрэчкі паступова заціхлі. Загаварыў цехнарук—Сэлаўёў, матальшчыцы дружна замахалі рукамі.

— Згодны мы, згодны! Перарабляй на верхнія!

І толькі Нюша задзёрыста свае цьвярдзіла:

— Вось яшчэ чаго. Навошта нам пераробка гэта. Не жадаем!

Але яе стрымалі:



У матальным „Чырвонага Тэкстыльшчыка“ (Менск).



Івана-Вазьнясенская ткацкая ф-ка, машыны савецкай вытворчасьці.

— Не траплі языком, буза!

Але ўвесь гэты шум балаўствам здаваўся ў параўнаньні з тым гамам, які ўзьняўся па сканчэньні дакладу майстра аб устаноўцы рам да матальных станкоў. Вольга добра прыкмеціла як Гарасім увесь уздрыгануў, калі зразумеў, што ноўшаства майстра робіць непатрэбным працу вязальшчыкаў. Ён таптаўся на месцы, часта-часта міргаў вачыма, глушыў нарастаючы гул.

— Непатрэбны нам рамы! бяда толькі з іх!

— Нюша падтрымоўвала Гарасіма.

— А вязальшчыкаў куды падзенеце? На вуліцу?

Але вось устала Вольга. Рухам рукі яна папрасіла памаўчаць і загаварыла:

— Таварышы, вы не разумееце карысьці, таму і артачыцеся!.. Рамы, аб якіх далажыў нам майстар вельмі патрэбны для фабрыкі.

Гарасім прыўстаў і, здавалася, зьесьці вачыма зьбіраўся Вольгу.

Вольга вочы ў бок адвяла.

— Пры ўстаноўцы рам,—працягвала яна,—ня будуць валяцца каля машын катушкі, нам ня прыдзецца справу мець з зьвязкама гэта дасьць ашчаду на шпагаце, -галоўнае...

Тут Вольга запнулася, хвіліну маўчала, пасьля выразна закончыла:

— А галоўнае, наш матальны аддзел не патрабаваць вязальшчыкаў.

Калі Вольга зварочвалася на месца, наўкола білі ў ладкі.

— Вось дык дзеўка! Сама просіць, каб жаніха скарацілі!—рэзка пішчала Нюша.

Дзесяткі вачэй праводзілі Вольгу. Многім вядомы былі яе адносіны з Гарасімам. А зараз дзівавaліся ўсе яе словам.

І тут учула Вольга каля сябе ласкавы многа-разумеючы голас Капітоніхі:

— Нічога, нічога, золатца... Жаніхоў у цябе многа будзе, а фабрыка—адна!

Урэшце замахала старая на ўсіх рукою:

— Чаго раскрычаліся? Справу вырашаць трэба... Вольга—малайчына, пра фабрыку клапаціцца.

Нехта падтрымаў:

— Правільна!.. Ды яшчэ паглядзі, на другую якую работу вязальшчыкаў прыладзяць... Хопіць работы.

— Таварышы, хто за тое, каб прыставіць рамы да матальных машын—паднімаліся рукі!

Прыслухоўваючыся да вясёлага гулу галасоў, Вольга з полёгкаю ўздыхнула.

Інструктар ф-кі „Кастрычнік“.

ЗАМАЦАВАЦЬ НА ГРАМАДЗКАЙ РАБОЦЕ.

У гэтым годзе па Беларусі скончылі сваю працу 1028 дэлегацкіх сходаў. Звыш 30 тысяч работніц, батрачак, бяднячак і сераднячак выпушчана з дэлегацкіх сходаў. Прыступілі да працы новыя дэлегацкія сходы. І зараз паўстае сур'ёзная задача: адначасова з уцягненьнем у практычную работу, уноў абраных дэлегатак замацаваць на грамадзкай рабоце старых дэлегатак.

У час перавыбарчай кампаніі дэлегатак, партыйныя ячэйкі, саветы, прафсаюзы павінны былі наметіць цьвёрды плян скарыстаньня на грамадзкай рабоце старых дэлегатак. Гэтага зроблена ня было, Вынікі перавыбараў кажуць аб тым, што ў цэлым шэрагу вёсак за летні час работа з старымі дэлегаткамі ва многіх месцах развалілася і дэлегаткі ня прымалі ніякага ўдзелу ў перавыбарчай кампаніі.

Гэта зусім ненармальна. Дэлегацкія сходы мінулага году выхавалі значны лік работніц, батрачак, бяднячак і сераднячак, якія прымалі актыўны ўдзел у грамадзкай працы, дапамагаючы партыйным і савецкім арганізацыям у арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва, стварэньні калгасаў, правядзеньні нарыхтовак, распаўсюджваньні пазыкі індустрыялізацыі і інш.

Ні ў якім разе нельга забываць гэты актыў. Трэба гэты актыў замацаваць на грамадзкай працы—ён

Дэлегатка т. Плескашэўская работніца Меншвэю, уступіла ў партыю.

зьяўляецца значным рэзэрвам, з якога партыйная арганізацыя зможа чэрпаць кадры для запаўненьня апарату савецкіх і грамадзкіх арганізацый новымі сіламі.

Між тым, мы маем шэраг прыкладаў, калі гэтай працы не аказваюць належнай увагі. Напрыклад, у **Сьвіслацкім раёне, Бабруйскай акругі** старыя дэлегаткі зусім ня прымаюць удзелу ў грамадзкай рабоце.

Такое ж становішча мы маем у **Клімавіцкім раёне, Магілеўскай акр.**

У вёсцы **Кузьмінічы, Любінскага раёну** два гады існуе дэлегацкі сход, а працы з старымі дэлегаткамі не вядзецца.



Дэлегатка т. Шостак—работніца Меншвэю, уступіла ў партыю.

Некалькі лепш справа з дэлегацкімі сходамі на прадпрыемствах. Напрыклад, **ячэйка малага рамонту на чыгунцы ў Менску** разьмеркавала працу паміж старымі дэлегаткамі: трое дэлегатак замацована для працы ў сэкцыі аховы здароўя Гарсавету. П'янава працуе ў культкамісіі мясцкому. Градоўская—паслана на вучобу на курсы чырвонага крыжу. Лабуць скончыла курсы ахматмладу і зараз вылучана загадчыцай яслей, Вялічка ўступіла ў партыю.

Намеціла плян работы з старымі дэлегаткамі таксама і **ячэйка Камунальнікаў у Магілеве.**

Аднак гэтага мала. Трэба дамагчыся, каб усе старыя дэлегаткі былі скарыстованы на грамадзкай рабоце, каб яны не адсеяліся ад працы.

Што трэба зрабіць?

Зараз-жа пераглядзець склад старых дэлегатак і праверыць, як яны скарыстоўваюцца.

Лепшую частку дэлегатак работніц, батрачак і бяднячак трэба ўцягнуць у шэрагі партыі, прымацаваць да школ і гурткоў партасьветы, каб дапамагчы ім падрыхтавацца да ўступленьня ў партыю.

У мінулым годзе частка дэлегатак ня зьнішчыла сваёй няпісьменнасьці, трэба зараз-жа ўцягнуць іх у школы і лікпункты.

Дэлегатак, якія актыўна працавалі ў вытворчых камісіях і ў фабзаўмясцкомах трэба нагрузіць сталай прафработай, у прыватнасьці шырока скарыстаць у камісіях для распрацоўкі дагавароў па сацспаборніцтву і заключэньня каляктыўных умоў.

Калгасьніц дэлегатак магчыма скарыстаць для кіраўнічай работы па асобным галінам гаспадаркі (напрыклад, малочнай гаспадаркай, сталоўкай, дзіцячымі яслямі і іншым).

Таксама неабходна скарыстаць і перавыбары камітэтаў узаемадапамогі, якія адбудуцца ў сьнежані гэтага году.

Партыйныя арганізацыі, прафсаюзы і саветы павінны зараз-жа абгаварыць кандыдатуры старых дэлегатак, якіх магчыма вылучыць на сталую і кіруючую работу ў савецкіх, прафсаюзных і гаспадарчых органах.

Работу з старымі дэлегаткамі трэба безадкладна распачаць.

Рабкоркі, сялькоркі, старыя дэлегаткі! Пішыце, як пастаўлена ў вас праца з старымі дэлегаткамі.

Р.

Клімаўшчына—раён суцэльнай каляктывізацыі.

Да мінулага году на Клімаўшчыне было толькі 16 каляктыўных гаспадарак: усе гэтыя калгасы аб'ядналі толькі 154 двары, на двух тысячах гэктараў зямлі. Былі і зусім дробныя калгасы па 50 — 60 гэктараў. Самі вялікі калгас апрацоўваў толькі 200 гэктараў.

Выканаць пастанову 15 партзьезду аб перабудове дробнай адналічнай сельскай гаспадаркі ў буйную каляктыўную — вось задача, якую паставіла перад сабой партарганізацыя Клімаўшчыны.

Пераканаць, упэўніць беднякоў і серадняко ў перавазе каляктыўнага земляробства. З усёй энэргіяй узяліся за гэтую задачу партыйцы Клімавіцкага раёну. На працягу 2-х год упарта вялі яны работу па згуртаваньню бядняцка-серадняцкіх мас, вакол справы каляктывізацыі. Тысячы беднякоў абгаварвалі гэтае пытаньне на сходах беднаты. Сялянкі на жаночых сходах горача спрачаліся аб калгасах.

Вялікую работу прарабілі рабочыя; яны складалі брыгады для работы ў вёсцы, сабралі звыш 5000 р. для арганізацыі трактарнай калёны.

Ускалыхнулася вёска. Многатысячная бядняцка-серадняцкая маса адгукнулася на заклік партыі. Захапіліся творчаскай работай партарганізацыі. Буйныя калгасы зламалі ўсе межы, суцэльным полем зацьвілі яравыя вясной 1929 году.

Трыццаць семь новых калгасаў зарганізаваліся на Клімаўшчыне, 5711 сямей аб'яднаюць яны, на 80 тысячах гэктараў зямлі будуецца новая сельская гаспадарка. Да 12 тысяч гэктараў ахопліваюць самыя буйныя калгасы раёну. Звыш тысячы хутарскіх гаспадарак ліквідавалася і ўлілося ў калгасы.

Клімаўшчына займае першае месца на Беларусі ў справе калгаснага буданіцтва. Вялізарная работа праведзеная ў раёне дала значны ўздым актыўнасьці працоўных мас. Актыўны ўдзел прынялі бядняцка-серадняцкія масы і ў справе хлебанарыхтовак. Буйныя чырвоныя абозы прывезьлі хлеб дзяржаве. Плян нарыхтовак па раёну выкананы каля 170 проц. Звыш чым на 112 тысяч рублеў падпісаліся на З пазыку індустрыялізацыі працоўныя раёну.

„Ленінскі шлях".

Першы буйны калгас на Беларусі — „Ленінскі Шлях" за год свайго існаваньня значна замацаваўся. Відавочна павялічылася ўраджайнасьць: бядняк атрымаў ураджай амаль на 70 проц. больш, як у мінулым годзе ў адналічнай гаспадарцы, а серадняк на пяцьдзесят процантаў больш. Калгасам пасаджаны новы сад на 17 гэктараў. Заложаны сады і ў другіх калгасах; у калгасах „Ленінскі Шлях", „Бальшавік" пабудованы млыны. У цэлым шэрагу калгасаў абагулены сродкі вытворчасьці і жывёла, будуюцца агульныя хлявы для жывёлы. Калгас „Бальшавік" зараз электрафіцыруецца, ставяць слупы калгасьнікі, каб правесьці электрычнасьць ў будынкі. Мэдпункт пабудованы ў калгасе „Камунар" Магілеўшчыны.

У шэрагу буйных калгасаў праведзена радыё і арганізаваны лікпункты.

Шэраг уноў арганізаваных калгасаў, нават яшчэ не зямляўпарадкаваных правялі каляктыўную апрацоўку пад зяб.

„Ленінскі шлях" зьявіўся лепшым агітатарам за каляктывізацыю. Ён значна дапамог справе далейшай каляктывізацыі раёну.

З усяго раёну прыяжджалі ў летні час дэлегацыі з вёсак пабачыць як будуюць калгасьнікі сваё жыцьцё, а дзьве дэлегацыі нават пехатою за 200 кілёметраў прышлі.

У 12 вярстах ад „Ленінскага Шляху" вёска Савінічы. Парашылі сяляне каб лепш выведаць пра жыцьцё калгасу паслаць старога дзеда ў выглядзе жабрака.

Пашоў жабрак у „Ленінскі Шлях", абышоў усе хаты, пабываў у полі і зьвярнуўся дадому.

Па ўсім хатам хадзіў і ніхто ня кажа, што дрэнна ў калгасе жывецца, а ў полі аўсы вышэй за мяне росту.

Першым запісаўся дзед у каляктыў. А цяпер у калгасе „Камунар" Магілеўшчыны 500 сямей на 9 тысяч гэктараў зямлі.

„Самастойная гаспадыня".

Нежадалі спачатку сялянкі ісьці ў каляктыў, падпадалі некаторыя бяднячкі і серадняцкі пад уплыў кулацтва.

— Пацягнуць цябе на прыгон — пужалі кулакі. З адналічнай гаспадаркай цяжка было разлучацца.

Вось на жаночным сходзе растлумачвае сакратар райкому:—Многа працы жанчыне ў адналічнай гаспадарцы, трэба ёй раненька ўстаць, жывёлу даглядзець; дзіцёнка пакалыхаць, накарміць; страву згатаваць, бульбу пасадзіць, убраць; лён трапаць, воўну часаць, прасьці.

— Але за то я самастойная гаспадыня, па амбару вольна хадзіць—гарачыцца адна бяднячка.

— Толькі што ў амбары то ёсьць? Нічога няма—сьмяюцца жанчыны, слухаюць далей.

— Жнейка, малатарка заменіць цяжкую працу жанчыны, у яслях выхоўваць—даглядаць будуць дзяцей.

— Першай запішыце мяне ў каляктыў — перамоганая заявіла бяднячка.

Першы трактар.

А калі загудзеў у „Ленінскім Шляху", першы трактар усе калгасьнікі вышлі яго з песьнямі сустракаць. Пашоў узрыхляць глебу трактар, а з бераж ку якраз былая палоска бяднячкі-ўдавы.

Убачыла гэта ўдава і ў прысядку.

— Ай-да трактy!

Усю маю палоску схапіў ды павёз.

Відавочна ўбачылі сялянкі перавагу аб'яднанага гаспадарнічаньня: трактар, машыны, уздым ураджайнасьці, полёгкі працы жанчыны.

Ва ўсіх буйных калгасах Клімаўшчыны ўлетку былі палявыя яслі. Сталі яны падтрымоўваць беднату, каб арганізаваць каляктывы. У калгасе „Бальшавік" бяднячка першай запісалася ў каляктыў, ня гледзячы на пагрозы мужа разводам.

Калгасы перамаглі.

Шалёнае супраціўленьне аказалі кулакі, усё што маглі рабілі яны, каб пашкодзіць калгаснаму будаўніцтву. Тайныя сходы зьбіралі кулакі і заможнікі, пагражалі забойствам камуністым і беднякам-актывістым, падгаварвалі беднякоў. А калі не памагло, дык прыбеглі да тэрору: падпалілі хату старшыні Макеявіцкага сельсавету, паранілі руку бяднячцы, барану разьбілі бедняку-калгасьніку, калі выехаў ён араць поле „Камунара", моцна пабілі карову беднячкі, выбілі вока каню калгасьніка.

Але пацярпелі паражэньне. Не паслухалі іх беднякі і сераднякі, а калі нежадаючыя ісьці ў калгасы сяляне—„нехацімцы", як іх празвалі на Клімаўшчыне пабывалі ў „Ленінскім Шляху", дык самі заявілі, што будуць прасіцца, каб прынялі іх у „Ленінскі Шлях".

Яшчэ шпарчэй беднякі і сераднякі кідаюць дзедавы лад вядзеньня гаспадаркі — пераходзяць на каляктыўную.

Руйнуецца старое.

Зрух у каляктывізацыі гаспадаркі такі вялікі, што ламае ўсё старое. Творыцца новы быт. Апусьцелі царквы, не хапае папам прыбыткаў, пачалі яны адмаўляцца ад сану. Лазавіцкі і Савіцкі папы і разьнянскі равін прышлі прасіцца, каб іх прынялі ў калгас.

— Не патрэбны нам такія, адказалі аднадушна калгасьнікі.

У буйным калгасе да 12 тысяч гэктараў, які аб'яднае ўвесь сельсавет „Чырвоны Пуцілавец", царкву перабудавалі пад клюб. А калі зьнялі з купалу крыж, узьвіўся чырвоны сьцяг. На месцы разьнянскай сынагогі зараз працуе яўрэйская школа. Пад школы аддалі цэрквы і сяляне ў некаторых другіх калгасах. Вынясьлі іконы, павесілі плякаты і партрэты.

Новае жыцьцё будуецца.

Успамінае стары дзед — калгасьнік, як жылося раней.

— Раней — кажа — бывала напрэшся бульбы, бо паесьці другога няма, шчаўлю нахлябаешся і вазьмеш свайго каня, плуг сам падпіраеш, бо конь ад ветру валіцца, а жонка за повад каня цягне. І арэш паласу... А паласа такая, што калі ляжа добры кот, дык хвост пападзе на чужую паласу. Так і цягнешся назад і ўперад, па вузенькай палосцы. А калі раньнем птушкі запяюць, дык так нудна стане, здаецца пугай-бы разагнаў.

А цяпер пару запражэш, там трактар гудзе, дзеўкі на полі пяюць, дык здаецца тыя самыя птушкі, ды пановаму сьпяваюць.

Прыслухоўваешся зранку, калі арэш на полі, а жаўранак так прыгожа сьпявае: „каляктыў—каапэратыў, каляктыў—каапэратыў".

Ды на што жаўранак, варона і тая сьпявае: калі пад хутарам ляціць дык крычыць „кулак-кулак", а над намі—дык „калгас-калгас".

Таксама адчуваюць сябе і астатнія калгасьнікі, з усёй адданасьцю працуюць яны, разьвіваюць сваю гаспадарку.

Большасьць сельсаветаў на Клімаўшчыне цалкам каляктывізавана, толькі дваццаць процантаў зямлі раёну асталося на адналічных гаспадарках.

10 калгасаў раёну ўжо маюць радыё. У гэтым годзе адчыняецца па раёну 5 новых хат-чытален, праводзіцца пачатак электрафікацыі раёну, намячаецца пабудова малочна-сыраварнага заводу. Трыццаць новых трактараў чакаюць палі калгасаў.

А калі пачынаецца ў „Ленінскім Шляху" дзень, гукі самадзельнага барабану юных піянэраў завуць „Дзінь-бом! дзінь-бом! Ленінцы выходзь на работу!"

Так уздымаецца новае жыцьцё.

Пад кіраўніцтвам Ленінскай Партыі будуецца сацыялізм.

Галіна.

Дзень каляктывізацыі.

Чоткім россыпам
сьмех дзявочы
ў перадраньнім
фабрычным жыцьці...
Белы дзень
разам з ёй прыкрочыў,—
— зазьвінела сірэнамі
ціш.

І калі
ля варштату стала
нечаканы
сонечны бліск,
заіграў на суровым мэтале
залатою
сьвяркаючай рыскай.

Творчы міг
гэраічнае працы
у суладзьдзях сталёвых струн...
Будзе сёньня
ў калгасы ўбірацца
залатая мая
Беларусь.

І ў сымфоніях
трактарнай песьні
ад заводаў найлепшы згук
ўсёй сям'ёй
урачыста прынесьлі
шчырасьць працы рабочых
рук.

Страпянуліся думы ўспамінам
...Дзе прасторы
смугою павіты,
у шоўкава-зялёных нізінах
зарунела
калгаснае жыта.

І ў зяленіве
белыя гмахі,
а рабіны, бы сьцяг пурпурны...
калі сонца
фарбуе заход—
шэлест зор,
нібы песьня зурны

Запаўняюць калгаснай сям'ёю
сьветлы дом...

І старэнькая маці
ўзыйдзе роўнай
вячэрняй хадою
у былую
вялікасьць палацу.

...Ціхім россыпам
сьмех дзявочы
у фабрычным гульлівым жыцьці,
хто, калі гэту быль
напрарочыў
песьняй трактараў
вызваніў ціш?

Ўсё ярчэй на суровым
мэтале
залаты і трэпятны бліск.
Па-над горадам
сонца ўстала
вялічавым
васеньнім
дыскам.

Е. Пфляумбаум.

БА 829

Недахопы пад абстрэл.

Патрабуем чысткі сацскладу.

Бараначны цэх адрозьніваецца ад усяго прадпрыемства. Большасьць работніц—у 17 асоб і ўсё-ж крык, лаянка, нават бойка—звычайнае зьявішча туті ў часе працы.

Гоберман—вядома і па-за прадпрыемствам. Гэта яна выказала: „хай гарыць завод, мне ўсёроўна“. За такія антыпралетарскія настроі ўжо раз выключылі яе рабочыя з сваёй сям'і.

Але саюз уступіўся. Гоберман дала абяцанку ня выкідваць „фокусаў“, парушаючых працоўную дысцыпліну.

Абяцанка так і засталася толькі абяцанкаю. Гоберман і зараз вядома недысцыплініраванасьцю, яна і зараз ня імкнецца стаць на правільны шлях. Рабочых, якія робяць ёй заўвагі, яна абзывае правакатарамі і іншымі грубымі словамі.

Рада Гоберман вылучэньню, асабліва камуністых. Але рада па своему: „Добра, што пазбаўляемся ад іх у цэху“—гаворыць яна.

Бараначніца Жук—страшыдла ў цэху. І ня дзіва. Аднойчы Жук за грудзі з усёй сілай рабочага схапіла і ўсё гэта ў час працы.

Сьліжук у час працы дрэмле соладка, спрасонку садзіць баранкі адзін на другі. Работніца Мінкіна ўмее хапаць цеста і кідаць на падлогу.

З работніцай Лявінчык наогул заўком наш занадта нянчыцца. Лявінчык буяніць ня толькі ў цаху, а ўсюды: ня выканалі яе патрабаваньні—біцца кідаецца. На крытыку—адказвае лаянкай, пагрозамі.

Дзе-ж ячэйка, камуністы працуючыя ў цаху, заўком, дзе зьменорг?

Зьменорг—Гольдман ня раз кідалася партбілетам. Яна і сама ня супроць лаянкі і крыку. Яшчэ ня забылі ўсе зьдзекі Гольдман над работніцай Чартовай. Ад Розенблюма-ж можна чаго хочаце чакаць, толькі ня прыкладу ў рабоце.

Ня трэба думаць, што ў нас на заводзе толькі кепскае.

Побач з Гоберманамі і Жукамі працуе здаровая частка рабочых, адданная вытворчасьці. Работніца Чартова першая падала заяву ў заўком аб павышэньні нормы выработкі на 10 проц. Работніца Баркана на 300 проц. заработку падпісалася на 3-ю пазыку індустрыялізацыі.

2-е рабочых таго-жа бараначнага цэху Але і Давідаў падалі заяву аб уступленьні ў партыю Леніна.

Мы робім такі вынік: у нашых радах ня месца падрыўшчыкам сацыялістычнай вытворчасьці.

Сьвядомая частка рабочых настойліва патрабуе чысткі складу рабочых хлебазаводу, патрабуем перагляду сацыяльнага складу рабочых. Злоўжываньні на заводзе сыгналізуюць нам, ці не пралез вораг у шэрагі рабочых, ці не спрабуе ён засланяючыся званьнем пралетарыя, шкоднічаць. У нас ужо былі выпадкі падкідваньня ў машыны кавалкаў жалеза, у цесьце знаходзілі кавалкі дрэва і дробныя цьвікі.

Шкоднік пакуль ня злоўлены, але ён будзе злоўлены. Наша завадзкая сям'я вызваліцца ад людзей з варожымі пралетарыяту імкненьнямі.

М. Берман.

Хлебазавод, Менск.

Мы і самі... нічога ня робім.

Кузьмінская спажыўкаапэрацыя не праводзіць ніякай працы сярод пайнікаў. Няма ніводнага каапэратыўнага кутка, ніякай культработы. У працы з жанчынамі нічога не рабілася. Не абгаварвалася нават пытаньне аб ільготным каапэраваньні другога члена сям'і. Жанчын каапэравана ўсяго каля 10 проц. Лавачная камісія непрацуе, ніхто не інструктаваў яе, а сябры лаўкамісіі запытваліся, што ім рабіць, дык атрымоўвалі такі адказ: „Мы бяз вас усё зробім“.

Актыву няма, пайнікі няпрыцягваліся да працы. Каапэратыўны жанарганізатар хоць і маецца, але нічога ня робіць, бо яго ніхто не інструктаваў.



Каапкамісія камтрэсту за работаю (Менск).

У выніку пайнікі адарваны ад каапэрацыі, ня ведаюць яе працы. Каапэрацыяй кіраваў дагэтуль сын былога стражніка. У час чысткі савецкага апарату гэта ўсё выкрыта. Трэба наладзіць масавую працу.

Камсамолка.

БА 829

Пазбаўленцы шкодзяць.

Лошыцкія батрачкі ў перавыбарах дэлегатак прымалі актыўны ўдзел. Дэлегаткі мінулага году ў спрэчках гаварылі аб тым, што партыйнае кіраўніцтва работаю было вельмі слабае, сельсавет кепска адносіўся да працы дэлегатак, не прыцягваў іх да працы сельсавету і розных палітычных кампаній. Дэлегаткі ня былі ўцягнуты ў грамадзкую працу. Ня выхоўваліся дэлегаткі для ўцягненьня ў партыю і камсамол.

Калі пачаліся выбары дэлегатак, то кулакі і іх падпявалы выступалі супроць абраньня батрачкі дэлегаткай, яны казалі: „Гэта ня нашы людзі, хай ідуць адкуль прышлі і хай іх там абіраюць".

Чамусьці на гэтым сходзе галасавалі нават пазбаўленыя выбарчых праў, як, напрыклад: кулак Асядоўскі Базыль з вёскі Лошыца.

Вельмі р'яна выступаў супроць батрачак падкулачнік Пятух Рыгор, быўшы пад чаркаю. Кулакі сваяволілі так на сходзе таму, што тут на гэты раз зусім адсутнічалі партыйны і камсамольскі асяродак. Ячэйка ЛКСМ Лошніцы замест таго, каб дапамагчы ў гэтай палітычнай кампаніі, распачала ў гэты час пасяджэньне бюро з усімі камсамольцамі, у час калі сход спрабавалі сарваць кулакі.

Але, ня гледзячы на вялікія перашкоды кулакоў, у склад новага дэлегацкага сходу абрана 6 батрачак.

Каранкевіч.

Цяганіншчыкі шкодзяць вылучэньню.

Аршанскі калгассаюз паслаў тэлеграму Мсьціслаўскаму РВК аб вылучэньні на курсы трактарыстаў жанчыну.

Абгаварылі гэта пытаньне ў калгасе „Чырвоны дзень", парашылі вылучыць на курсы трактарыстаў калгасьніцу, быўшую батрачку.

Накіравалі яе ў Горкі. А загадчык курсамі вось як спаткаў вылучэнку:

— „Хто цябе паслаў? На курсы цябе залічыць ня можам, едзь назад у Воршу ў калгассаюз".

Што тут рабіць—думала вылучэнка.

— Я застануся на курсах, а вы запрасіце калгассаюз, каб даслалі, што неабходна акрамя маёй паперкі—просіць вылучэнка, паказваючы тэлеграму.

Але загадчык курсаў няўмалімы, вылучэнка мусіла заварачваць аглоблі.

Вось як цяганіншчыкі шкодзяць вылучэньню калгасьніц. Трэба, каб гэтай справай пацікавілася Аршанскае РСІ.

Хамякова.

Ворша.

Украў чужы допіс.

Звычайна сялькоры пішуць у рэдакцыю допісы самі, пішуць пра тое, што бачылі.

Інакш робіць Людчык Марк, з вёскі Раўнапольле, Сьмілавіцкага раёну. Гэты спрытняк узяў допіс Сянкевіча Ал. з газэты „Зьвязда" за 12 лістапада, сьпісаў яго з газэты, замест Прапойскі раён напісаў: „Сьмілавіцкі раён", падпісаў свае прозьвішча і прынёс для надрукаваньня ў часопісі „Беларуская Работніца і Сялянка".

Такіх сялькораў нам не патрэбна.

Рэдакцыя заўважыла гэта крадзества, допіс не друкавалі.

НА АБАРОНУ КРАІНЫ САВЕТАЎ.

Узмацняем абарону краіны.

У час правядзеньня кампаніі перавыбараў дэлегатак, на сходзе работніц і жонак рабочых пры саюзе Будаўнікоў было ўзьнята пытаньне аб зборы сродкаў на пабудову самалёта „Дэлегаткі".

Работніцы адгукнуліся,—ужо сабрана каля 25 рублёў. Акрамя гэтага агульны сход пастанавіў праз друк выклікаць дэлегатак Магілеўшчыны на збор сродкаў на пабудову самалёта „Дэлегаткі".

Мы просім рэдакцыю, праз часопісь узьняць пытаньне аб правядзеньні кампаніі па збору сродкаў на пабудову самалёта „Дэлегаткі".

Магілеў Н|Д—Дом Працы.

Ад рэдакцыі. Рэдакцыя цалкам падтрымоўвае ініцыятыву Магілеўскіх дэлегатак, але растлумачвае, што сродкі, зьбіраемыя на самалёты, канцэнтруюцца ў фондзе абароны краіны пры газэце „Зьвязда" куды і трэба іх накіроўваць.

Падарунак Дальня-Ўсходняй арміі.

Падводзячы вынікі посьпехаў дасягнутыя намі ў сацыялістычным спаборніцтве, мы, рабочыя фабрыкі „Дзьвіна", аднадушна парашылі адпрацаваць 2 гадзіны ў фонд дапамогі чырвоным байцам Дальняга Ўсходу і выклікаем пасьледаваць нашаму прыкладу фабрыку імя „Карла Маркса" і ўсіх тэксьтыльшчыкаў Беларусі.

Прэміі ў карысьць Мопру.

Работніцы працкаляктыву 1-е мая нядаўна падводзілі вынікі выкананьня саддагавору.

Договар выкананы на 106%, прагулы паменшаны, колькасьць браку зьніжана з 14 да 4%, а ў вязальным цэху да 2%.

Лепшыя работніцы, брыгадзісткі, арганізатары індывідуальнага сацспаборніцтва прэміраваны. Брыгада з 20 работніц атрымала ў прэмію аблігацыю 3-й пазыкі і адразу-ж перадала яе ў карысьць Мопру.

Яшчэ 18 работніцам выдадзены ў якасьці прэміі пісьменныя прыборы, значкі і іншыя.

Адна з іх Восіпава сваю прэмію перадала ў карысьць Мопру.

Віцебск. **Шнэерава.**

Пярсьцёнкі на абарону.

На сходзе работніц станцыі Віцебск МББ чыгункі было пастаўлена пытаньне аб абароне краіны. Тут мы склалі камісію з 10 асоб, якой даручылі распаўсюджваць пазыку індустрыялізацыі, Падпісаліся на 3 пазыку—177 жанчын на 1960 рублёў.

Акрамя таго, парашылі адпрацаваць адзін дзень у карысьць абароны краіны. Сабрана грашыма 9 руб. 25 капеек і 2 залатых пярсьцёнкі.

Куксінская.

ст. Віцебск

Пісьменная—навучы няпісьменную.

Рост народнай гаспадаркі нашай краіны, шпаркае будаўніцтва новых фабрык і заводаў, саўгасаў і калгасаў патрабуе і значнага ўздыму культурнага ўзроўню працоўных мас. Няпісьменнасьць—вялікая перашкода ў нашай сацыялістычнай стройцы.

Няпісьменнасьць трэба рашуча перамагчы ў самы хуткі тэрмін. За справу зьнішчэньня няпісьменнасьці павінна ўзяцца ўся грамадзкасьць гораду і вёскі.

У вёсцы яшчэ большая частка сялянак няпісьменныя, увесь актыў павінен дапамагчы батрачцы, бяднячцы і серадняцы навучыцца пісьменнасьці, каб стаць актыўным удзельнікам вялікай стройкі, якую вядзе зараз рабочая кляса ў саюзе з бядняцка-серадняцкімі масамі сялянства.

У гэтым годзе на Беларусі арганізавана шмат школ па зьнішчэньню няпісьменнасьці. Цэлая армія работніц і сялянак змагаецца ў іх за новае жыцьцё, за аўладаньне ведамі.

Але гэтага недастаткова. Ёсьць значная частка сялянак, якія па сваім сямейным умовам ня змогуць наведваць лікпунктаў.

Агульнымі сіламі трэба дапамагчы ім вучыцца. Дэлегацкія сходы павінны дапамагчы няпісьменным, склаўшы асобныя групы для заняткаў з няпісьменнымі жанчынамі.

Пісьменная дэлегатка, актывістка таксама зможа навучыць няпісьменную—гэтым яна выканае вялікі грамадзкі абавязак. Сельсаветы, камісіі па палепшаньню быту работніц і сялянак, настаўніцтва дапамогуць ёй у гэтым.

Рэдакцыя часопісі ўзьняла зараз пытаньне, каб праз часопісь арганізаваць навучаньне няпісьменных і малапісьменных жанчын. У кожным нумары нашай часопісі будзе зьмяшчацца старонка няпісьменнай. Па гэтай старонцы актывістка зможа праводзіць заняткі.

Рэдакцыя зварачваецца да ўсіх чытачак з прызывам узяцца за гэту важную работу.

Рэдакцыя просіць чытачак, якія будуць вясьці гэту работу, паведаміць аб гэтым рэдакцыю.

МАКАРЫХА

Ёй пяцьдзесят тры гады. Маленькая сухая, такая сухая, што суседкі кажуць пра яе: „У чым толькі дух трымаецца“.

Калі-ж пачне ўвясну гарод лапаціць—маладым не ўвагнацца.

Век свой у клапотах правяла Макарыха, усё некалі.

Сын Макарыхі, Хведар, хлапец хоць куды: працавіты, уважлівы. Ён комсамолец, з чытанкаю і сходамі сябруе.

А Макарыха журыць яго:

— І што ты добрага знайшоў там? Моладзь у максамоле задзёрыстая і пра бога нядобрае пяюць. Не хадзіў-бы ты ленш у чыталку, Хведар.

Хведар кніжку прынясе, чытае, а маці слухае. Любіла Макарыха чытанку слухаць, толькі сама ад вучобы абаімі рукамі адмахвалася.

— Навошта мне?

— Эх, мама, ды вось слухаеш, калі я чытаю, цікава!

Макарыха аджартоўваецца:

— Ну вось і добра: ты пачытаеш, я паслухаю. А мне нікчаму, дзяды і так векавалі, жылі.

Неяк увечары Макарыха да суседкі сабралася. Тая насустрач ёй.

— Куды ты любая?

— Да цябе выбралася. А ты?

— Я на лікпункт, вучуся.

— Ты? Няўжо вучышся на старасьці?

— А чаму не? Чытаць стала—сьвет убачыла.

— Цудоўна. Суседцы сорак год, а яна, бы дзяцёнак, вучыцца.

Суседка запрашае:

— Пойдзем у школу, Макарыха, цікава там!

Позна зьвярнуўся Хведар дамоў, на сходзе быў. А Макарыха сядзіць і лемантар перад ёю.

— Малюнкі разглядаеш — усьміхаецца Хведар—пісьменнасьці абучаешся?

Усьміхаецца і Макарыха.

— Малюнкі вось паглядзець кожны здолеш, матуля; скажам і ты к прыкладу—справа лёгкая. А каб прачытаць!

Вось глядзі, гэта слова—„Ленін“.

Падсеў Хведар, чытае, што пад малюнкамі напісана. Як зразумела робіцца ўсё!

І толькі як запелі пеўні схамянулася Макарыха.

— Пара спаць сынок. Ну і балаўнік ты, угаварыў старую ўзяцца за навуку.

Праз тры месяцы Макарыха сама па складам газэту чытала.

В—ов.



МАЛЫЯ ПРАЦАЎНІКІ.

Праца—магутны сродак у выхаваньні дзяцей. Узрасьціць у дзіцяці цікавасьць, любоў да працы—галоўная задача выхаваньня дзяцей.

Здаровае дзіця—шустрае, рвецца да працы, у жвавасьці ўкладае ўсю сваю энэргію.

Бацькі недаверлівы да працы свайго малыша.

— А, куды яно варта, малое, лепш я сама за яго зраблю—гаворыць маці, і мые дзіцёнку ручкі, тварык, кашульку адзявае.

— Навошта малому даручэньні даваць? сапсуе ўсё толькі—кажа маці і ня заўважваючы, не жадаючы сама таго, псуе калечыць сваё дзіця.

Пасьля такое мацярынскае апекі дзеці часьцяком зьяўляюцца ў школу ці сад—бруднымі, адзеньне скідаюць на падлогу, бо яны звыклі, каб усё падбірала матуля.

Маці не павінна думаць, што дашкольнік ня здолен сабе часткова даглядзець. Няхай ён сам мыецца, а маці толькі падкажа, як гэта вымыцца чысьцей і вады не праліць. Няхай дзіця само паставіць на месцы абутак, пакладзе адзеньне. Паступова яно звыкне да ладу і ня будзе турбаваць, і патрабаваць ад дарослых дробнага догляду.

Дзіця павінна рабіць для сябе ўсё на што толькі хапае яго сілы.

Паступова малыша трэба прывучаць выконваць даручэньні ня толькі па самаабслугоўваньню, але і наогул для сям'і. Шкодна перагружаць малых працаю, бо ад гэтага страчваецца цікавасьць да працы.

Маці павінна шанаваць працу малышоў.

Дзяўчынка мые бялізну лялькі. Безладзьдзе, сырасьць. Маці злуецца, прымушае дзіця спыніць гульні—і перашкаджае прывыкаць да працы.

Здаровае імкненьне дзяцей да працы маці тлумачыць балаўствам, яна хваліць спакойнага, маўклівага дзіцёнка, сама ня ведаючы таго, што рухавасьць імкненьне да працы—паказчыкі здароўя.

Няхай дзіця будзе самастойным, спыняць яго можна толькі тады, калі шкодзіць другім, ці самому пагражае небясьпека парэзацца, укалоцца. Нават маленькага дзіцёнка ня трэба спыняць, калі ён спрабуе што-небудзь занесьці, на месцы пакласьці, памыць кубак, лыжку, дапамагчы падаваць к сталу. Мацеры трэба паклапаціцца — здаволіць дзіця матар'ялами для забаў. Маючы пад рукамі такія матар'ялы, дзіця вучыцца карыснаму і ня блытаецца ў дарослых пад нагамі, не хапае тое, чаго нельга.

Нездаволеныя матар'ялам дзеці пачыняюць самі шукаць яго. Спадзішка адрэжа кавалачак настольніцы, сукенкі, хустачкі, ножыкам стол разламае ці канапу.

А маці сама вінавата, што не здаволіла матар'ялам, а тут яна карае малыша:—„Навошта папсаваў, не баўтайся пад нагамі"—лаецца маці на нявіннае дзіця.

Дзеці любяць працу. Прыгледзьцеся да малыша, ён ніколі ня міне і падбярэ кавалачак паперы, пробку, скрыначку, матузак, шпульку. Усё гэта яму патрэбна. Гляньце, ужо майструе дзіця: у дзірачку шпулькі працягнула вяровачку, прывязала скрыначку, спрабуе вазіць. „Возік, аўтамабіль"—ляпеча малыш.

Калі-ж даць дзіцяці крышку клею, паперы, гладкіх кавалачкаў дрэва—вось і цацкі. Малое само дабярэ ладу з імі. А маці дапаможа даўшы куток і скрынку для складаньня цацак.

Крыху большае дзіця і само скрынку змайструе, дайце яму толькі дошчачак, малаток, ды цьвікоў некалькі. Само-ж дзіця можа змайстраваць палічку дрыўляную для мыла.

Такая самастойная праца карысна яшчэ і таму, што ў ёй дзіця замацоўвае свае нагляданьні, вопыт, разьвівае рукі і вока, робіцца больш умелым, лоўкім.

Маляваць і ляпіць любяць дзеці ўсіх узростаў. Нават двухгадовік спрабуе алоўкам па паперы поўзаць.

Маляваць за дзіця, ці яго рукою—вельмі шкодна. Убачаўшы ваш малюнак свая праца здаецца няхайнай, няўдалай, згіне цікавасьць да маляваньня. Змалёўваньне па абразчыкам таксама шкодна, бо гэта замінае дзіцячую ініцыятыву і наглядальнасьць.

Маляваньне разьвівае рукі і вока, прывучае прыглядацца да жыцьця. Маляваные і лепка прывучае дзіця выкладаць, адбіваць свае думкі ў малюнку, ці глінянай цацкі.

У дзяцей павінна быць папера, аловак чырвонасіні. Ня трэба даваць дзіцяці сшытак, бо ён усю яе закрэмзае. Хай лепш карыстаецца асобнымі лісткамі, прывучаючы скарыстоўваць абодва бакі. Вельмі добра даць дзіцячую хварбу і кістачку.

Каб малышы прывыкалі к парадку трэба даць ім картонную папку для складаньня малюнкаў і палічку адвесьці.

Значнасьць працы для дзяцей вельмі вялікая. Абавязак мацеры—паклапаціцца, стварыць добрыя ўмовы для таго, каб з яе дзяцей расла працавітая зьмена,—карысная для грамады.

Маршак.

АРГАНІЗУЕМ КУТКІ ДЗІЦЯЦІ.

З кожным годам усё больш уцягваецца работніц у прамысловасьць, усё больш удзельнічаюць работніца і жонка рабочага ў грамадзкай рабоце. Пагэтаму зараз трэба асабліва падумаць аб тым, каб сямейна-бытавыя ўмовы не перашкаджалі грамадзкай рабоце жанчыны. Калі работніца ў час сваёй працы ў вытворчасьці адводзіць дзіцёнка ў яслі, альбо ў дзіцячы сад, то ўвечару яна бывае ня можа пайсьці на сход у клюб, альбо ў школу таму, што няма на каго пакінуць дзіцёнка. Для таго, каб работніца і жонка рабочага змагла вольна ўдзельнічаць у грамадзкай рабоце трэба стварыць куткі дзіцяці пры клюбах і чырвоных кутках. У гэтым кутку зможа матка-работніца і жонка рабочага заставіць дзіцёнка на час, калі яна будзе вучыцца ў школе, альбо прысутнічаць на сходзе.

Дзіцячыя пакоі, альбо куткі можна стварыць пры кожным клюбе. Падумаць аб гэтым павінны культ-камісія фабкому, дэлегаткі, актывісткі, працуючыя ў праўленьні клюбу.

Дзіцячыя пакоі таксама пажадана стварыць у буйных дамах Жакту.

Для таго, каб стварыць дзіцячы куток трэба ў першую чаргу вылучыць адзін пакой у клюбе, альбо доме Жакта. Абсталяваньне дзіцячага пакоя не патрабуе вялікіх затрат. Мэблю маленькага разьмеру, сталы і лаўкі, крэсьлечкі—магчыма заказаць у сталярнай майстэрні, альбо купіць у каапэрацыйнай краме; набыць ўмывальнік, тазік уціральнік, вешалку, графін і некалькі кубачкаў і гаршочкаў. Усё гэта ня будзе многа каштаваць. Трэба падабраць і цацкі. Цацкі павінны быць бязумоўна гігіенічнымі, кіраўніцы дзетсаду змогуць параіць, якія лепш цацкі набыць для дзяцей.

Каб праводзіць з дзецьмі гульні трэба арганізаваць саміх матак. Магчыма праводзіць дзяжурствы матак, таксама прыцягнуць да заняткаў і піанэраў.

Такім чынам дзіцячы куток зарганізаваць зусім проста. Усе работніцы і жонкі рабочых павінны дамагацца, каб пры сваім прадпрыемстве стварыць такія куткі.

Патрэбны такія куткі і на вёсцы. У кожным калгасе абавязкова трэба стварыць вячэрнія дзіцячыя куткі, асабліва ў тыя дні, калі праводзяцца сходы альбо займаюцца лікпункты і гурткі.

У вёсцы магчыма ствараць часовыя дзіцячыя куткі ў хаце-чытальні, альбо ў хаце адной з актывістак. Шырока прыцягнуць да гэтай справы камісіі па палепшаньню быту і жанчын, якія маюцца пры сельскіх саветах.

Дэлегаткі работніцы і жонкі рабочых, калгасьніцы, арганізуйце дзіцячыя куткі.



Мы ня сумуем у дзіцячым кутку.

Чаму бывае вецер.

Часта мы бачым як кіпіць вада ў гаршку. Яна хутка перамешваецца. Ад чаго-ж бывае гэты бязупынны рух вады пры гатаваньні?

Зразумеўшы гэта, для нас стане вядома і тое, „ад чаго бывае вецер?“

Вада складаецца з частак. Яна мае вагу. Тыя часткі вады, якія знаходзяцца на дне гаршка мацней награюцца ад дна гаршка, бо дно датыкаецца да агню. Зразумела, что гэтыя часткі будуць значна пашырацца, а пагэтаму рабіцца лягчэйшымі і падымацца ўгару. Іх месца зоймуць ненагрэтыя больш цяжкія часткі вады. У сваю чаргу яны хутка нагрэюцца ад гарачага дна гаршка і падымуцца ўгору і гэтак далей. Вось дзякуючы чаму мы назіраем бязупынны рух вады пры яе гатаваньні.

Паветра таксама мае вагу і складаецца з частак. Тыя часткі паветра, якія непасрэдна датыкаюцца да зямлі награюцца ад яе, робяцца мякчэйшымі і хутка падымаюцца ўгару. Іх месца займаюць ненагрэтыя часткі паветра. Зямля-ж награецца ад сонца.

Вось такім чынам, калі ў тэй ці іншай мясцовасьці сонечныя прамені нагрэюць зямлю, ад яе награецца і паветра. Яно зробіцца лягчэйшым і падымецца ўгару. Яго месца будзе занята халаднейшым больш цяжкім паветрам з акаляючых мясцовасьцяй.

Гэты рух паветра мы і называем ветрам.

А. Поляк.

Менск.

Гутарка дэлегаткамі

— Ну, Мар'я, прабяжы па хатам, пакліч дэлегатак на сход,—загадаў кіраўнік.

— У хатах з іх нікога няма, па хлявох ды гумнах рассыпаліся: стада, машыны аглядаюць, а калгасьніцы тлумачаць ім пра парадкі нашы.

— Гэта добра, што цікавяцца калгаскім жыцьцём, але ўсё-ж пакліч, час сход пачынаць.

Хутка клюб калгасу быў поўны дэлегаткамі, яны жвава гутарылі—дзяліліся ўражаньнямі пасьля агляду гаспадаркі калгасу.

— Пачынаем таварышы,—сказаў кіраўнік дэлегацкага сходу,—сёньня мы абгаворым даклад старшыні нашага калгасу.

Нашым жанкам вядомы справы калгасу. Але сёньня трэба аб некаторых пытаньнях пагутарыць — пачаў старшыня калгасу.

— Дык вось, таварышы, пад нашым загадам плошча зямлі ў 280 гэктараў, ёсьць у нас коней 17, кароў 54, ды сьвіней 72 штукі.

— Цю, спрытнякі якія! Год як на сьвет нарадзіўся, а паўсотні кароў, ды 72 сьвіньні маюць—мабыць крэдыту многа ўзялі?—няўцерпела Арына з хутару.

— Ды не гарачыцеся. Я ўсё папарадку далажу. Гэта яшчэ ня ўсё наша багацьце. Маем мы малатарку, касарку, конныя граблі, на жняярку і бульбакопку заяўку падалі.

А зараз пагутарым, з якіх крыніц нажылі мы ўсё гэта.

Аб'ядналіся мы ўсяго год таму назад, пачалі гаспадаркі ў купы складаць: у кожнага плужок, барана—у большасьці каняка, хоць і дробны.

Калі-ж аб'ядналі мы поласы, абмеркавалі так: навошта нам 26 плугоў, барон, столькі-ж коняй? Мы сваю зямлю і дзесяткам плугоў узрыхлім, пакуль трактар набудзем. А там калі будзе, гэты сталёвы канёк, тады пабачыце як запрацуе!

Коняй горшых—інвэнтар непатрэбны прадалі, далі крэдыту і за гэтыя грошы набылі стада малочнае, машын. Вось як гаспадарым мы.

Ураджаю жыта сёлета мелі 90 пудоў з дзесяціны.

— Браце мой, няўжо 90 на тых самых палосках дзе 40—60 мелі!

Як бачыш. Попелу, мінэральных, іншых угнаеньняў далі, межы ўзаралі—рассаднікі пустазельля зьнішчылі і зямлі кавалак прыбавіўся, ну, вядома засявалі чыстагатунковым насеньнем, апрацоўвалі добра і ў тэрмін.

Вось чым мы 90 з дзесяціны выгналі.

З наступнага-ж году пераходзім на правільны 8-палёвы севазварот. Хлявы будуюць агульныя, пральню, лазьню. А хутка і сталоўка агульная будзе.

— А як у калгасе, калі захварае хто?—цікавіцца батрачка Марына.

— Захварэе,—лячыць будзем і нават цяжарная жанчына на месяц да і месяц пасьля родаў водпуск мае—не працуе, а плату атрымоўвае, так і ў час хваробы.

— О дзякуй за ласку—перабіла Арына,—тады кожны гультай у вас можа хворым прыкінуцца.

— Памыляецца Арына. Гультаі нам у калгасе непатрэбны зусім. Кожны рабочы дзень калгасьніка—улічваецца, і калі-б на працу ня вышаў здаровы калгасьнік, то яму-ж горш, бо пры расплаце ён менш грошай атрымае.

— Выходзіць, што і тут вы добра прыдумалі--заўважыла Ганка—хворыя ў даглядзе, праца за іх паробцена, і гультаям недзе пладзіцца.

— Вядома, зараз нас і на повадзе ня выцягнеш з калгасу—разважае Наста. Вось хутка жняярку па полю пусьцім, годзі сьпіны гнуць над сярпом, а там паднацісьнем—і трактар у полі загудзе. Яські з гэтага году арганізуем абавязкова.

Ганну зайздрасьць ўзяла:

— А што-ж самі тады рабіць будзеце, калі жніво на жняярцы будзе, дзеці ў яськях?

— Работа знойдзецца—адказала Мар'я.

— Сьвіней дагледзець трэба, кароў, птушку як аграном раіць, з садам работы многа, у сыраварцы, ды трэба і пачытаць, павучыцца, бо няпісьменныя будзем—які-ж з цябе гаспадар, калі сьляпы.

— Гутарылі мы ці мала—заўважыў кіраўнік, а зараз абгаворым рэзалюцыю па справаздачы калгасу. У каго ёсьць прапановы якія?

— А мы вось пра хлявы гаварылі. Новыя толькі праз год будуць. Я прапаную, каб у хлявох на гэты год кармушкі хоць просьценькія змайстраваць,—прапанавала дэлегатка, прымацованая да праўленьня калгасу.—Сена ў глум ня пойдзе і для каровы смачней.

— Памятаеце, як аграном раіў стада карміць?—Запытала Мар'я.—„Кармі рэпай, бураком, тады будзеш з малаком". Я прапаную стада па норме карміць.

— Правільна загудзелі дэлегаткі,—і хлявы ўцяпліць трэба, хоць колькі магчыма, усё цяплей жывёле: дзюркі замазаць, падсьцілу больш паслаць.

У каго яшчэ прапановы ёсьць?

— А памойму, нам трэба сельска-гаспадарчы гурток арганізаваць, каб самім больш ведаць у сельскай гаспадарцы—выказалася Алена.

— І яшчэ памайму, санітарная камісія наша кепска працуе. Вось Ганна прымацавана да санкамісіі, трэба разварушыць яе работу: студню да ладу давесьці, кватэры агледзець, двары каб чыстыя былі і многае іншае.

— І яшчэ прапаную, каб калгасьніцы ўсе выпісалі „Беларускую Работніцу і Сялянку".

— Калгасьніцы чытаць будуць, сьвядомасьць, культурнасьць іх узрасьце, а тады кожная будзе і ў калгасе лепш гаспадарыць.

Н.

ПАРАДЫ АГРАНОМА

Уцяпляйце хлявы.

Сьцюжа прыносіць вялікую шкоду ў сельскай гаспадарцы, калі жывёла знаходзіцца ў неацепленых хлявох. Яшчэ ў шэрагу калгасаў і большасьці бядняцка-серадняцкіх гаспадарак жывёла знаходзіцца ў халодных хлявох. Жывёле, асабліва рагатай, патрэбна цяпло, тэмпэратура цела каровы 38 градусаў Цэльсія. Гэту тэмпэратуру жывёла павінна трымаць заўсёды. Зьніжэньне тэмпэратуры, хаця-б на адзін градус, выклікае хваробу. Патрэбную тэмпэратуру жывёле прыходзіцца выпрацоўваць з кармоў. Таму чым халадней памяшканьне, тым больш патрэбна кармоў на саграваньне цела жывёлы.

У цёплым хляве карова дае больш малака, чым у халодным, таму, што корм, які ў цёплым хлеве ідзе ў каровы на ўтварэньне малака, у халодным хлеве—ідзе на саграваньне цела жывёлы. Таму ў халодным хлеве ўдой ніжэй; праз шчыліны ў варотах і сьценах адначасова з цяплом уцякае і малако. Чым халадней хлеў, тым больш патрабуе жывёла корму. Таму халодныя хлявы самыя нявыгадныя для гаспадаркі. У халодным хлеве карова стаіць на мёрзлай зямлі і гнаі. У вялікую сьцюжу каровы пакрываюцца іняем, шэрсьць робіцца густой і махнатай, абрастае і вымя, якое вельмі загразьняецца гноем.

У халодных хлявох нельга задаваць жывёле цёплага корму: запарку мякіны, цёплага пойла, вады і іншае; даваць цёплы корм на сьцюжы вельмі небясьпечна, жывёла можа прастудзіцца і захварэць.

У халодных хлявох цяжка дапамагаць пры родах; жывёла мучыцца і народжанае можа лёгка прастудзіцца. Прыходзіцца іх зараз-жа браць у хату. У хаце заводзіцца гразь і смурод.

У халодных хлявох нельга падмываць вымя ў каровы, а гэта неабходна і мыць трэба цёплай вадой і ў цёплым хлеве. Мыць вымя на марозе, значыць застудзіць яго, вада на вымені не прасохне ператворыцца ў лёд, зробіцца запаленьне вымя, якое лячыць на стужы вельмі цяжка.

У халодных хлявох прыходзіцца даіць у кажусе з аўчын, а гэты кажух носіць на сабе многа крыніц заразы, загразьняе малако. Працаваць у кажусе нялоўка, даіць таксама.

Адсюль—цяпло ў хляву патрэбна як жывёле, так і таму, хто яе даглядае. Вось чаму так патрэбна ўцяпліць хлявы.

Жанчыны-калгасьніцы, бяднячкі і сераднячкі павінны зараз-жа паклапаціцца, каб уцяпліць хлявы для жывёлы. Гэта дапаможа падняць удойлівасьць кароў і з каровы „навозьніцы“ зрабіць „вядзерніцу“.

У калгасах, дзе яшчэ не пабудавалі новых хлявоў для жывёлы, трэба на зіму ўцяпліць існуючыя. Кожная бяднячка і сераднячка таксама зможа ўцяпліць сваі хлявы.

Уцяпляць хлявы можна простым спосабам накштал таго, як уцяпляюць хату проста і танна: абкладваючы на зіму сьцены саломай, альбо імхом—якія забіваюцца паміж жардзінамі і сьценамі. Уцяпляць магчыма, насьцілаючы на столь салому, труху, кастру і гэтак далей. Уцяпляць магчыма абшываючы дзьверы саламянымі матамі, старымі мяшкамі, дзяругамі і гэтак далей. Заканапачываць шчыліны і дзюркі паклею, імхом і інш. Уцяпляць магчыма і более цеснай устаноўкай жывёлы, чаму і могуць служыць нам прыкладам каляктывы, дзе жывёла стаіць па правілам навукі ў простых стойлах, што даступна ў кожнай гаспадарцы; даўжыня стойла для каровы 2 аршыны 13-15 вяршкоў, адлегласьць каровы ад каровы 2 аршына.

Уцяпляць хлявы патрэбна так, каб тэмпэратура ў хляве была прымерна 8-10 градусаў цяпла. Для кароў і сьвіней памяшканьне пажадана яшчэ цяплей. Авечкам і коням патрэбна менш цёплае памяшканьне.

Уцяпліць хлеў трэба хаця-б да такой ступені, каб у ім не замярзаў гной, бо мёрзлы траціць частку сваёй сілы.

Яшчэ ў хляве патрэбен сьвет. Сьвет добра ўплывае на здароўе жывёлы, павышае прадукцыйнасьць яе. У сьветлых памяшканьнях цяляты заўсёды бываюць ласкавыя, не палахлівыя, а ў цёмных наадварот, часта вырастаюць паўдзікія. У цёмных хлявох звычайна заводзяцца розныя шкодныя бактэрыі, якія заражаюць малако і жывёлу—жывёла сумуе, менш есьць, а значыцца і малака дае менш.

Вокны трэба прарубаць у хлявох праміж 2 і 3 вянцом, разьмерам 8×4 і 10×4½ вершка.

Корм жывёле трэба задаваць не пад ногі, як часта водзіцца, а ў якіх-небудзь кармушках. Без кармушак шмат корму гіне, затаптваецца ў гной самы каштоўны прадукт, як лісточкі і галоўкі клеверу. Добрая кармушка накштал скрынкі, воз'сена зьберажэ—гаворыць прыказка.



Падсьцілкай служыць азімая салома, дрывяное лісьце, хвоя, мох, торф, апілкі, стружкі, але дробная (рэзаная) салома больш прыгодна, так як больш убірае вільгаці як цэльная, значыцца і гной лепшы. Мох утрое больш уцягвае вільгаці (жыжы), чым салома.

Такім чынам уцяпленьне хлявоў дае вялікую карысьць для гаспадаркі. Усе калгасы і бядняцка-серадняцкія гаспадаркі павінны ўцяпляць свае хлявы.

Мізецкі.

Беражы здароўе

БУДУЙЦЕ ЗДАРОВЫЯ КАЛГАСЫ.

Ахова здароўя і санітарнае становішча маюць вялікае значэньне ў разьвіцьці калгасаў. Трэба дамагчыся, каб арганізаваць здаровы быт у калгасах, гэтым павінны займаца *санітарныя камісіі калгасаў*, іх задача сачыць, каб калгасы знаходзіліся ў добрым санітарным становішчы.

Вялікае значэньне мае *жыльлёвае пытаньне*. Хаты ў вёсках у большасьці цесныя і брудныя, маленькія вокны, ня маецца фортак для праветрываньня, у хаце разам з людзьмі знаходзіцца хатняя жывёла. Няма ўборных, студні ня ўтрымліваюцца ў чыстаце і недастатна глыбока выкапаны, ня маюць агульнага вядра.

Санітарныя камісіі павінны дамагчыся, каб у хатах і каля хат ня было бруду, каб хаты кожны дзень

Зьлева—сялянкі гутараць з камунаркамі. Справа—гуртавая праца.

праветрываліся. У кожным калгасе павінны быць добрыя студні, уборныя і выграбныя ямы.

Пры пабудове новых дамоў трэба лічыцца з запатрабаваньнямі гігіены, значыцца, каб у будынку было дастаткова сьвету і воздуха, устраіваліся форткі для праветрываньня. Пры пабудове новых будынкаў трэба параіцца з мясцовым урачом як па пытаньню выбару мейсца пабудовы, так і пры самой пабудове і разьмеркаваньні жыльцоў.

Харчаваньне ў калгасе трэба, паставіць так, каб яно садзейнічала аздараўленьню калгасьнікаў. У бядняцка-серадняцкай сям'і харчаваньне ў большасьці нездавальняючае, яно вельмі аднастайнае і амаль не адрозьніваецца ў розныя сэзоны (зімой і летам). Страву ядзяць у большасьці брудным рукамі з агульнага посудку. Таму ў вёсцы наглядаецца шмат страўнічных хвароб.

У калгасах трэба паклапаціцца, каб палепшыць харчаваньне, гэта лягчэй зрабіць пры агульнай сталоўцы. Тут санкамісія зможа весьці нагляд, каб прадукты харчаваньня былі добраякасныя і захоўвалася чыстата пры прыгатаўленьні стравы і ядзе. Трэба дабіцца, каб перад ядой мыліся рукі і кожны меў асобны пасудак.

У вёсцы сялянка ня можа карыстацца адпачынкам да і пасьля радоў, ад гэтага сялянкі часта хварэюць і хутка старэюць. У калгасах трэба дамагацца, каб жанчыны—сябры калгасаў карысталіся такім адпачынкам, як і работніца (два месяцы да радоў і два пасьля).

Санкамісія павінна сачыць, каб адпачынкі сапраўды даваліся калгасьніцам.

Арганізацыя ясьляў павінна быць важнейшай задачай па аздараўленьню быту. У ясьлях маці будзе вучыцца правільнаму догляду дзяцей, а за калгасьніцай і сялянка навучыцца лепш выхоўваць дзяцей, каб зьберагчы іх ад дачаснай сьмерці. Тое-ж датычыцца і дзяцей большага ўзросту, арганізацыя дзіцячай пляцоўкі, дзе змогуць гуляць пад добрым наглядам, правільна выхоўвацца, таксама павінна адыграць вялікую ролю ў аздараўленьні маладога пакаленьня.

Трэба, дамагчыся актыўнай барацьбы з рэшткамі старога быту. Сюды перш за ўсё адносіцца *барацьба з алкагалізмам*. Шкоду спажываньня сьпіртных напіткаў, нават умеранай выпіўкі—трэба шырока асьвятляць сярод калгасьнікаў. Праз сьценгазэту, на агульных сходах сьвядомыя калгасьнікі павінны асьвятляць шкоднасьць п'янкі для будаўніцтва новага быту ў калгасах. Трэба скласьці грамадзкую думку супроць алкаголя. Адначасова трэба рашуча змагацца з самагонаварэньнем і шынкарствам.

Трэба канчаткова выжыць веру ў знахароў. Яшчэ зараз ёсьць выпадкі, калі бабкі і роды прыймаюць і аборты робяць, загаворам і ўсялякімі снадоб'ямі лечаць.

Трэба каб калгасьніцы зварачаліся на мэдычны пункт да ўрача альбо фэльчара. Трэба змагацца з усякімі знахарамі, шаптунамі і бабкамі.

Усе гэтыя задачы будуць выкананы ў тым выпадку, калі сярод калгасьнікаў будзе ліквідавана санітарная няпісьменнасьць.

Гэта павінны рабіць чырвоныя куткі і клюбы ў калгасах, арганізоўючы лекцыі, гутаркі, даклады ўрача, кіно-карціны па бытавым пытаньням, яны памогуць зьнішчыць шкодныя рэшткі старога быту.

Наглядаючы, што ў калгасе здаравей і чысьцей, як у вёсцы, што жанчына знаходзіцца ў лепшых бытавых умовах, сяляне і сялянкі зразумеюць, што калгасы дапамагаюць аздараўленьню жыцьця, і цяга ў калгасы павялічыцца.

Такім чынам калгасы і ў гэтай галіне стануць школай новай вёскі.

(У скарочаным выглядзе перакладзена на белмову з часопісі „Гігіена і здар. раб. сял. сям'і).

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА.

Д. Г.—Напішэце нам, якая праца сярод беднаты праводзіцца партячэйкай у вашай вёсцы.

Допіс ваш мы накіравалі ў „Беларускую Вёску".

М. Чабор—Частушкі друкаваць ня будзем—слаба распрацованы, „Падзяка жанчын"—спазьнілася.

Г. О.—Дэлегатка на грамадзкай працы—пераслана ў „Беларускую Вёску".

Кучынскай—Напішэце больш падрабязна аб гаспадарчым росьце камуны, як справа з пісьменнасьцю камунарак. Ці ўступіла камуна ў сацыялістычнае спаборніцтва, і як камунаркі дапамагаюць у разьвіцьці гаспадаркі камуны.

Напішэце, які ўплыў камуны на беднату і серадняцтва акаляючых вёсак.

Т. Таршыс—Апошняя ваша карэспандэнцыя ня зьмешчана з прычыны таго, што невядома было, аб жім ідзе гутарка.

М. Хадасевіч—Аб вашым калектыўным гародзе—ужо пісалася ў „Белрабсялянцы".

Зубкову—Вершы друкаваць ня будзем — слаба распрацованы.

Гдале Трайер—Як дэлегаткі выконваюць сваю пастанову аб арганізацыі чырвонага абозу. Колькі грошай імі сабрана на пабудову лятака.

Мішкінай—Напішэце, як калгасьніцы дапамагаюць у выкананьні дагавору сацыялістычнага спаборніцтва.

Ведаючы—„Актыўная жанчына" — друкаваць ня будзем, напішэце аб гэтым у насьценную газэту.

Карнейчык—Аб ліквідацыі няпісьменнасьці—друкаваць ня будзем — агульныя разважаньні. Пішэце, як пастаўлена ліквідацыя няпісьменнасьці ў вас па раёну, як справа з уцягненьнем у лікпункты жанчын, асабліва—ахоп лікпунктамі батрачак, савгасьніц, калгасьніц і дэлегатак.

Эйдлінай—Напішэце, як работніцы Дубровенскай Мануфактуры ўдзельнічаюць ў сацспаборніцтве, змагаюцца за зьніжэньне сабекошту, за якасьць прадукцыі, з прагуламі. Наогул больш падрабязна напішэце, як практычна дапамагаюць работніцы ў ажыцьцяўленьні пяцігодкі. Допіс ваш мы пераслалі ў „Зьвязду".

Таварышам, якія просяць залічыць карэспандэнткамі—адказ на гэта мы даем у спэцыяльным артыкуле, у старонцы рабсялькоркі.

Гердавай—Пішэце, як вы і іншыя актывісткі ўдзельнічаеце ў грамадзкай рабоце.

Т. Шнэеравай.—Аб перавыбарах дэлегатак вы пішыце: „Работніцы правільна ўсвоілі лінію партыі. Гаварылі аб сац. спаборніцтве" і г. далей. Але з допісу ня відаць аб чым-жа сапраўды гаварылі работніцы. Трэба было-б прывесьці характэрныя выступленьні іх, якія-б сьведчылі аб зацікаўленнасьці дэлегатак і ўдзеле іх у сацыялістычным спаборніцтве. Вы пішыце агулам: „Падрыхтоўчая работа праведзена добра", а ў чым складаецца гэта работа—невядома. У допісах давайце больш прыкладаў. Вы пішыце: „Разгарнулі здаровую крытыку"—але невядома аб якіх практычна недахопах гаварылі работніцы.

Т. Нарэжнай (Калінкавічы).—Вы таварыш пішыце, што зроблены агляд працы жанчын у каапэрацыі. Але што выявіў гэты агляд—з допісу ня відаць. Напішыце больш падрабязна аб працы вылучэнак у каапэрацыі. Пішыце аб удзеле працоўных жанчын у хлебанарыхтоўках.

Работніцы ф-кі „Профінтэрн". „Аб перавыбарах дэлегатак" друкаваць ня будзем. У карэспандэнцыі нічога не сказана, якія прапановы ўнасілі работніцы і жонкі рабочых, якую падрыхтоўчую работу праводзілі ў падшэфнай вёсцы.

Невядомаму. Друкаваць ня будзем пішыце, як праходзяць перавыбары дэлегатак, аб удзеле жанчын у дні ўраджаю і калектывізацыі.

Фрыдлянд—Пішыце аб удзеле працоўных жанчын у чыстцы савецкага апарату.

Гузелевіч. Аб яслях—спазьнілася.

Шклоўчанка—„Наша доля"—друкаваць ня будзем, слаба распрацована. Пішыце аб дні ўраджаю, аб рабоце грамадчын.

Савіч. Вершы распрацованы слаба.

Ст. Іва—Апавяданьне друкаваць ня будзем—слаба распрацована. Пішыце лепш практычныя допісы аб удзеле актывістак у грамадзкай працы. Давайце прыклады працы жанчын у савеце, каапэрацыі, грамадзкіх арганізацыях.

АДКАЗЫ НА ЗАПЫТАНЬНІ.

М. ЕФМАН—Вам выплачваецца ў месяц 35 руб. зарплаты, гэта значыць, якраз столькі, колькі з вамі было ўмоўлена.

Што датычыцца тэрміну з якога вам павінны выплачваць зарплату, дык гэтакім трэба лічыць 16-е чэрвеня, гэта значыць з таго дню, калі вы сапраўды пачалі працаваць.

Юрысконсульт ЦСПСБ Сумчынскі.

Тлумачэньні да прыкладзенай выкрайкі.

Эшыты па гэтай выкрайцы костгальтэр вельмі просты і зручны. Добра падтрымліваючы ён зусім ня сьціскае грудзі. Пры ўмелай кройцы на шытво ідзе вельмі мала паркалю, бо скроіць яго можна нават з абрэзкаў, якія заўсёды застаюцца пасьля шыцьця бялізны. Пры кройцы з цэлага кавалку паркалю заўсёды найлепш адразу скроіць два ці некалькі, тады можна лепш скроіць затраціўшы яшчэ менш паркалю. 1. Частка кроіцца ўдвое,



астатнія ўсе часткі ў адзін раз, дзьве часткі крояцца па выкрайцы, а пасьля зашываюцца вытачкі з пераду і з бакоў, робяцца хвалдачкі ці зборкі, столькі ян шырына пераду і боку. Пасьля трэба зтачыць 1, 2 і 3 часткі, прышыць паясок. Для паяска кроіцца простая палоска сантыметраў $2^1/_2$, па фігуры. Паясок звычайна вельмі хутка носіцца, таму яго лепш рабіць удвое ці ўтрое. Плечыкі робяцца па жаданьню той ці іншай шырыні.

ЦАНА асобнага нумару 10 кап.

У падшэфную вёску.

Супрацоўніцы Наркамфіну Залеская Б., Залеская Э., Бурэйка, Пятрыкевіч, Шындлер і Віткоўская перадалі падшэфнай вёсцы Лоша 6 сярпоў выйграных імі ў лётарэі „Беларускай Работніцы і Сялянкі".

Тое-ж зрабілі работніцы 1-й друкарні (Менск) Белкін, Шэйн, Дварэцкая, Зільберштэйн, Цыгельнік, Падзельская, Касьцюкевіч, яны перадалі падшэфнаму Талькаўскаму сельсавету 5 сярпоў, 1 касу і 1 калаўрот.

Таварыш Каліноўская перадала падшэфнаму сельсавету Дабрынёва 2 выйграных сярпы.

Адклад ня ідзе ў лад.

Дэлегаткі даручылі вербаваць падпіску на „Белрабсялянку" ўпоўнаважаным. Але яны гэту працу заўсёды на заўтра адкладаюць. Трэба падбіраць лепшых упаўнаважаных па збору падпіскі, каб грошы ў іх не валяліся па кішэням, а чытачкі не засталіся без часопісі.

М. М.

Рабсялькоркі.

Пішыце—як працуюць ударніцы на прадпрыемствах і ў саўгасах, як удзельнічаюць работніцы ў сац. спаборніцтве. Аб падрыхтоўцы і ўступленьні ў партыю работніц і батрачак. Пішыце аб працы лікпунктаў і ахопу імі працоўных жанчын, аб рабоце дэлегацкіх сходаў, пішыце як батрачкі бяднячкі і серадняцкі аб'яднаюцца ў калгасы, аб умовах працы і быту жанчын у каляктыўных гаспадарках. Пішыце як разгарнулася праца дашкольнага паходу. Пішыце аб практычнай працы грамадчыц і як дапамагаюць ім у рабоце.

Рабсялькоркі. Рашуча выкрывайце недахопы работы, праз часопісь змагайцеся з шкоднікамі, безгаспадарчасьцю, бюракратызмам, цяганінай.

З усёй сілай ударым па тых, хто скрыўляе ў рабоце лінію партыі—братаецца з кулаком і нэпманам.

Што рабіць, калі не атрымоўваецца часопісь.

У рэдакцыю паступаюць скаргі ад некаторых падпішчыкаў на неатрыманьне выпісанай часопісі.

Гэтыя падпішчыкі часткова задаволены, па астатнім-жа скаргам зараз вядзецца высьвятленьне, хто вінаваты ў недастаўцы часопісі,—для прыцягненьня да адказнасьці.

Усіх падпішчыкаў рэдакцыя просіць сачыць за атрыманьнем часопісі. У выпадку-ж згубленьня яе рэдакцыя просіць зараз-жа паведамляць у рэдакцыю наступнае: Прозьвішча і адрас падпішчыка, які № неатрыманы, дзе і каму здадзена падпіска, на які тэрмін (з якога па які месяц). Усе падпішчыкі прыслаўшыя заяўкі будуць безадкладна задаволены. Акрамя гэтага такое рэагаваньне падпішчыка, дапаможа рэдакцыі высьвятліць прычыну згубленьня часопісі і вінаватых прыцягнуць к судовай адказнасьці.

Ці ты ўжо падпісалася —) на часопісь (—

Ці ты ўжо падпісалася —) на часопісь (—

„Беларуская работніца і сялянка"

Падпіску можна здаваць на пошту, лістаносцам, у кіоскі ці прысылаць непасрэдна ў рэдакцыю.

Часопісь каштуе— у месяц: . . . . 15 капеек | Паўгода . . . . 90 капеек
3 месяцы . . . 45 „ | Год . . . . 1 р. 80 „

Цана асобнага нумару 10 кап.

Кожная актывістка, грамадчыца, дэлегатка, работніца, калгасьніца, саўгасьніца, бяднячка і серадняцка—павінна чытаць сваю часопісь „БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА".

Кожная актывістка павінна распаўсюджваць гэту часопісь.

Чытайце, распаўсюджвайце і пішыце ў сваю часопісь.

Адрас рэдакцыі: Менск, Карла Маркса 14, тэлефон—2-43.

Выдавец—Аддзел работніц і сялянак ЦК КП(б)Б. *Рэдактары:* С. Крэмер. Г. Рагазіньнікава.

Друкарня БДВ. Заказ № 396. Уліку 13.600 экз. Галоўлітбел № 304.